ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 68 (2428)
29 жніўня 1969 г. • ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

КІНЕМАТАГРАФІСТАМ САВЕЦКАГА САЮЗА

Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР сардэчна вітаюць і віншуюць кінарэжысёраў, сцэнарыстаў, акцёраў, аператараў, мастакоў і кампазітараў кіно, рабочых і служачых кінастудый і кінапрамысловасці, дзеячоў навукі і тэхнікі, кінакрытыкаў, арганізатараў фільмавытворчасці, кінафікатараў, кінамеханікаў і іншых работнікаў кінематаграфіі са слаўным паўвекавым юбілеем савецкага кіно.

Падпісаны Уладзімірам Ільічом Леніным 27 жніўня 1919 года гістарычны дэкрэт аб пераходзе фатаграфічнай і кінематаграфічнай прамысловасці ў веданне дзяржавы, паклаў пачатак развіццю кінематаграфіі ў нашай краіне на новай палітычнай і эканамічнай аснове. Кіно было пастаўлена на службу інтарэсам рэвалюцыі, задачам выхавання новага чалавека, будаўніцтва сацыялізма і камунізма. Геніяльнае ленінскае вучэнне, палітыка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы заўсёды натхнялі і вялі наперад савецкае кінамастацтва.

У. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў велізарнае значэнне кіно як моцнага сродку прапаганды рэвалюцыйных ідэй, як мастацтва, даступнага і блізкага самым шырокім народным масам. «З усіх мастацтваў, — гаварыў У. І. Ленін, — для нас найважнейшым з'яўляецца кіно».

Народжанае Вялікім Кастрычнікам, наша кінамастацтва ў сваіх лепшых творах заўсёды выказвала агульныя для ўсяго народа камуністычныя ідэалы. Работнікі кінематаграфіі на ўсіх этапах развіцця савецкага грамадства актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве новага жыцця і барацьбе з ворагамі сацыялізма, аддавалі сілы і талент фарміраванню перакананых, згуртаваных вакол партыі барацьбітоў за росквіт нашай Радзімы, за справу працоўных усяго свету. Цэлыя пакаленні савецкіх людзей з юных гадоў выхоўваліся і выхоўваюцца на гераічных, жыццесцвярджальных вобразах кінамастацтва, якія клічуць на патрыятычныя подзвігі ў стваральнай працы, актыўнай грамадскай дзейнасці, самаадданай абароне заваёў сацыялістычнага ладу.

У нашай краіне кіно ўпершыню стала вялікім, сапраўды народным мастацтвам, яго выдатныя творы атрымалі заслужанае прызнанне ва ўсім свеце і выконваюць важную ролю ў далучэнні самых шырокіх працоўных мас да багаццяў перадавой культуры.

Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР заклікаюць усіх кінематаграфістаў Савецкага Саюза і далей следаваць высокім традыцыям баявога, рэвалюцыйнага сацыялістычнага кінамастацтва!

Няхай святкаванне паўвекавога юбілею нашага кіно, які адзначаецца напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, будзе азнаменавана новым уздымам творчай актыўнасці майстроў мастацтва экрана, стварэннем яркіх кінатвораў, прысвечаных самым важным тэмам сучаснасці, гераічнай гісторыі народа, здзяйсненню бессмяротных ленінскіх ідэй.

Намаганні творчых калектываў павінны быць накіраваны на далейшае павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню савецкай кінематаграфіі, на барацьбу супраць чужых нашаму мастацтву ўплываў, супраць з'яўлення слабых, малазмястоўных карцін. Наша кінамастацтва заклікана і далей быць страсным прапагандыстам савецкага ладу жыцця, камуністычнай маралі, прыхільнікам міру і дружбы паміж народамі, непрымірымым байцом у бітвах з буржуазнай ідэалогіяй.

Няхай жыве і квітнее шматнацыянальнае савецкае кінамастацтва!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС — ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР — САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР

АКРЫЛЕНЫ КАСТРЫЧНІКАМ

Хроніка Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі адзначае: на другі дзень пасля штурму Зімняга Ваенна-рэвалюцыйны камітэт загадаў атраду ў 150 штыхоў узяць пад ахову тэатры Піцера. Сярод безлічы надзённых спраў У. І. Ленін і яго паплечнікі аддавалі шмат увагі мастацтву, як ідэалагічнай зброі выхавання працоўных мас. Прымаліся самыя рашучыя меры, каб перацягнуць на бок рэвалюцыі творчыя сілы інтэлігенцыі, здольныя прынесці карысць новаму грамадству.

Першыя арганізацыйныя мерапрыемствы партыі і Савецкай улады ў галіне сцэнічнага мастацтва былі як бы падсумаваны «Дэкрэтам аб аб'яднанні тэатральнай справы», падпісаным Старшынёй Савета Народных Камісараў У. Ульянавым (Леніным) пяцьдзесят гадоў назад. Гэта — гістарычны акт. Быў створаны ўрадавы орган — Цэнтральны тэатральны камітэт, на які ўскладваўся абавязак ажыццяўляць паўсядзённае кіраўніцтва тэатрамі, як дзяржаўнымі, так і тымі, што належаць асобным ведамствам. Тэатральная маёмасць абвяшчалася нацыянальным здабыткам, а фінансаванне ўсіх тэатраў, прызнаных карыснымі і мастацкімі, дзяржава прымала на сябе. Цэнтратэатру належала, у адпаведнасці з дэкрэтам, даваць тэатрам «указанні рэпертуарнага характару ў напрамку набліжэння тэатра да народных мас і іх сацыялістычнага ідэалу...»

Велізарнае значэнне мелі гэты дэкрэт і наступныя рэформы ў тэатральнай справе для развіцця сцэнічнага мастацтва вызваленых Кастрычнікам народаў краіны. Высокая місія тэатра — быць змагаром за перамогу камуністычнага светапогляду, выхаваўцам грамадзян-патрыётаў — натхняе ўсё новыя і новыя пакаленні дзеячоў савецкай сцэны.

У сузор'е выдатных тэатральных ансамбляў Савецкага Саюза ўваходзяць таленавітыя і па-творчаму самабытныя калектывы прафесіянальных артыстаў усіх нацый і нацыянальнасцей.

Станаўленне і росквіт беларускага нацыянальнага тэатра — адзін з прыкладаў перамогі ленінскай палітыкі ў галіне мастацтва. З першых крокаў і на ўсіх этапах жыцця краіны наш тэатр імкнуўся выступаць дзейсным памочнікам партыі ў фарміраванні духоўнага аблічча чалавека новага грамадства. На роднай мове, захоўваючы і ўзбагачаючы лепшыя традыцыі мінулага, карыстаючыся вопытам перадавой навукі аб мастацтве акцёра, выпрацаванай рускімі дзеячамі, беларуская сцэна брала актыўны ўдзел у стварэнні мастацтва партыйнага, народнага, ваяўнічага. У многіх і многіх спектаклях нашых тэатраў праўдзівае адлюстраванне гісторыі і сучаснасці спалучаецца з моцным эмацыянальным уздзеяннем на гледача.

Пасля Кастрычніка тэатральны рух у нашай рэспубліцы стаў небывалым па маштабах. Тысячы юнакоў і дзяўчат, рабочыя і сяляне, маладыя байцы Чырвонай Арміі ішлі на самадзейную і прафесіянальную сцэну, несучы з сабой светлы роздум аб рэвалюцыйнай эпосе і вострае пачуццё класавых ацэнак з'яў і канфліктаў. З такіх энтузіястаў складваліся калектывы, Першага БДТ (цяпер тэатр імя Я. Купалы), другога БДТ (цяпер тэатр імя Я. Коласа), опернай і балетнай труп, ТРАМаў...

Асноўнай школай для многіх з тых, каму выпала быць першымі акцёрамі беларускай прафесіянальнай сцэны, сталі выступленні ў армейскіх тэатрах перад воінамі маладой Чырвонай Арміі. У суровых выпрабаваннях грамадзянскай вайны гартавалася і наша тэатральнае мастацтва.

І тэмы вялікага гераічнага пафасу арганічна ўвайшлі ў беларускую драматургію, якая склалася як галіна літаратуры ў непарыўнай садружнасці з тэатрам. Творчасць Я. Коласа, Е. Міровіча, У. Галубка, К. Крапівы, Р. Кобеца, М. Грамыкі, Я. Рамановіча і іншых драматургаў давала на першых этапах развіцця нацыянальнага сцэнічнага мастацтва змястоўны і разнастайны матэрыял, пачэрпнуты з крыніц народнага жыцця.

Служэнне ленінскай праўдзе стала духам творчасці выхаваных тэатрам мастакоў сцэны. З'явіўся новы дзеяч сцэны — акцёр-грамадзянін, для якога дарагія прынцыпы праўдзівасці і рэвалюцыйнага пафасу ў творчасці. Склалася своеасаблівае творчае аблічча беларускага акцёрскага мастацтва, у якім спалучаецца глыбінная жыццёвасць з лірычным засваеннем сутнасці вобраза, сакавітая моўная палітра з завостраным пластычным малюнкам, гуманнае стаўленне да чалавека, чыё жыццё адлюстроўваецца на сцэне, з вялікай мастацкай сілай выкрыцця ўсяго агіднага і рэакцыйнага. Варта толькі прыгадаць цудоўныя вобразы, створаныя У. Уладамірскім, Л. Ржэцкай, К. Міронавай, Б. Платонавым, П. Малчанавым, І. Ждановіч, В. Галінай, Г. Глебавым, А. Ільінскім і многімі іншымі майстрамі — і гэта стане відавочным.

Разам з тэатрам рос і глядач. Дэкрэт Савета Народных Камісараў ставіў тэатр на пазіцыі, блізкія самым шырокім масам працоўных. І ў залы пайшлі людзі працы. Аўдыторыя ўжо сваім сацыяльным складам дыктавала тэатру тэматыку творчасці, патрабуючы, каб у святло рампы траплялі гераізм і хараство новай рэчаіснасці, каб у фокусе мастацтва былі галоўныя праблемы рэальнага жыцця.

Гісторыя гэтых пяцідзесяці гадоў дае мноства прыкладаў суладнасці паміж тэатрам і глядзельнай залай. Беларуская сцэна ведае прыклады таго, як артыстычныя калектывы чула адказвалі на самыя надзённыя запатрабаванні працоўных, што збіраліся на сустрэчы з мастацтвам ва ўтульныя залы і ў заводскія цэхі, пад адкрытым небам на калгасных гонях і ў франтавыя зямлянкі... І такое ўзаемаразуменне тэатра і гледача — вынік ажыццяўлення ленінскага дэкрэта.

Беларускае сцэнічнае мастацтва ўзнялося на такую вышыню і мае такі аўтарытэт, што самі дзеячы тэатра і грамадскасць прад'яўляюць яму самыя строгія патрабаванні. Ад кожнага спектакля мы чакаем новых творчых узлётаў, глыбокіх адкрыццяў і сапраўднага мастацкага хараства. Эстэтычныя крытэрыі ўзбагачаюцца, але непарушнымі застаюцца прынцыпы сацыялістычнага рэалізму, партыйнасці і народнасці.

Адзначаючы вялікія дасягненні і росквіт сцэнічнай культуры, грамадскасць выказвае гаспадарскую занепакоенасць тым, што нашы тэатры працуюць, бывае, ніжэй сваіх магчымасцей. Часам здзіўляе рэпертуарная непераборлівасць калектываў і іх кіраўнікоў. Скажам, Брэсцкі тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі справядліва ганарыцца тым, што сыграў больш 500 разоў патрыятычную драму «Брэсцкая крэпасць», але не вельмі ахвотна называе іншую лічбу — больш 400 прадстаўленняў па-рамесніцку складзенай «Небяспечнай прафесіі». А ў Віцебску тэатр імя Я. Коласа сарамліва хавае і не выносіць на афішу назву састарэлай па праблематыцы ды і наогул далёкай ад мастацкай дасканаласці п'есы «Родная маці», якая больш дзесяці гадоў скарыстоўваецца дырэкцыяй у касавых меркаваннях. Нярэдка яшчэ калектывы звяртаюцца да п'ес, якія не могуць спрыяць сапраўднай творчасці акцёраў і рэжысуры, возяць па гарадах і вёсках спектаклі накшталт «Захавай маю тайну», «Ты — гэта я!», «Дзесяць сутак за каханне»...

Аб гэтым нельга не гаварыць напярэдадні адкрыцця новага тэатральнага сезона — сезона 1969/70 гадоў. Рэпертуар — першы і галоўны паказчык таго, як артыстычная трупа, калектыў мастакоў адчувае пульс жыцця і патрабаванні часу. Вядома, што тэатр акумулюе сацыяльныя эмоцыі сучаснасці — яго абавязак быць на ўзроўні веку. Здрабненне тэматыкі і модны цяпер у некаторых рэжысёраў «інтым», пусты смех дзеля смеху, драматургія сутычак у тэмпературы камунальных кватэр — гэта адбірае ў нашых тэатраў каштоўную творчую энергію і зніжае іх ролю ў выхаванні высокіх пачуццяў.

Мінулы год не даў ні аднаго спектакля, які б мог стаць этапным для беларускай драматургіі і сцэнічнага мастацтва. Нават прэм'еры, прысвечаныя юбілею рэспублікі і грамадскасці сталіцы, — «Рудабельская рэспубліка» ў Акадэмічным тэатры імя Я. Купалы, «Рудабельская рэспубліка» і «Легенда аб песні непраспяванай» у Гомельскім абласным тэатры і «Брэсцкі мір» у тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі — не прынеслі вялікай радасці гледачам, не сталі ўзлётам сцэнічнай творчасці аўтараў і выканаўцаў. Заўважым, што ў спісе твораў, якія вылучаны сёлета на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР 1969 года, няма твораў драматургіі і тэатральнага мастацтва. Здаецца, такога не было даўно, каб год напружанай творчай дзейнасці драматургаў, акцёраў, рэжысёраў, мастакоў тэатра не даваў плёну, а заставаўся б годам чарговых «праходных» работ!

Магчыма, такія факты можна было б і не называць напярэдадні новага сезона, калі б не насцярожвалі некаторыя абставіны.

Па-першае, вядучыя калектывы рэспублікі — Акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, Вялікі тэатр оперы і балета і Дзяржаўны рускі тэатр імя М. Горкага пачынаюць сёлета працу без галоўных рэжысёраў. Ці здолеюць мастацкія саветы і дырэкцыя падтрымаць атмасферу высокай патрабавальнасці і весці творчае жыццё так, каб не было кампрамісаў і выпадковых рашэнняў? Вядома, што галоўны рэжысёр — не толькі пастаноўшчык найбольш значных па ідэйна-мастацкіх якасцях п'ес: яму належыць першае слова ў выбары рэпертуару, у захаванні творчага аблічча гэтага калектыву, ён кіруе прафесіянальным удасканаленнем трупы і працай чарговых рэжысёраў, ад яго індывідуальнасці, як мастака, густу і прынцыповасці часта ідзе нешта істотнае ў агульнай культуры творчасці.

Многа пытанняў узнікае і тады, калі знаёмішся з рэпертуарнымі планамі калектываў да канца 1969 года. Пакуль вядома толькі, што будзе пастаўлена з класікі — «Апошняя ахвяра» А. Астроўскага ў купалаўскім тэатры, «Улада цемры» Л. Талстога ў коласаўцаў і «Хаваншчына» М. Мусаргскага на опернай сцэне. П'есы гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі і прысвечаныя сучаснасці або яшчэ рэдагуюцца аўтарамі разам з рэжысурай, або толькі «ў задуме» (скажам, абодва беларускія драматычныя тэатры мяркуюць паставіць інсцэніроўку «Снежных зімаў» І. Шамякіна, але прымальнай інсцэніроўкі і дагэтуль няма). Патрабуюць дапрацоўкі і п'еса «Юнацтва рыцара» В. Зуба, прынятая да пастаноўкі Тэатрам юнага гледача, і «Лейтэнанты» А. Пінчука, здадзеная аўтарам тэатру імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Пэўныя «прагалы» ў рэпертуарных планах часткова тлумачацца тым, што ў пачатку наступнага года будзе завершаны рэспубліканскі конкурс на лепшую п'есу, абвешчаны Міністэрствам культуры БССР у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Надзеі могуць спраўдзіцца, і тэатры тады атрымаюць цікавыя творы. А ў той жа час ніхто не можа гарантаваць, што конкурс абавязкова прынясе той твор, які патрэбен менавіта гэтаму тэатру ў яго сённяшніх творчых шуканнях і на яго юбілейнай афішы.

Тэатральны сезон 1969/70 гг. надзвычай адказны. Драматургі, рэжысёры, артысты, мастакі, кампазітары — усе, хто аддае тэатру свой талент, зноў трымаюць экзамен на творчую сталасць. І справа тут не толькі ў тым, каб да юбілейнай даты паставіць спектакль з вобразам правадыра рэвалюцыі ў цэнтры. Трэба паклапаціцца аб тым, каб афіша і кожны спектакль адпавядалі самым высокім патрабаванням, каб на ўсёй творчасці дзеячоў сцэны зіхацелі водбліскі ленінскага разумення тэатральнага мастацтва і яго месца ў ідэалагічнай барацьбе. Створаны ўсе ўмовы для паспяховай працы ў гэтым напрамку, і ганаровы абавязак творчых калектываў дамагчыся новага ўздыму ідэйнасці і майстэрства.

Кожны свой творчы дзень работнікі тэатра могуць і павінны правяраць тымі здабыткамі, якімі мы ганарымся, — п'есамі і спектаклямі мінулых гадоў, што этапнымі вехамі адзначылі гісторыю нашай тэатральнай культуры за паўстагоддзя. Ёсць у нас дакладныя арыенціры. А рух наперад заўсёды звязаны з вывучэннем традыцый і вопыту папярэдніх гадоў. Тое, чаго дасягнуў беларускі тэатр пад сцягам ленінскай палітыкі ў галіне мастацтва, дае падставы верыць у новы творчы ўзлёт акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства, у новыя дасягненні драматургіі. Вітаючы дзеячоў тэатра з пачаткам новага сезона, масы гледачоў спадзяюцца ўбачыць у іх выкананні творы, вартыя самай урачыстай даты будучага года — стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна. І абавязак усіх творчых работнікаў сцэны спраўдзіць гэтыя вялікія спадзяванні шматлікіх аматараў папулярнага ў нашай краіне тэатральнага мастацтва.



Гродна па праву называюць горадам хімікаў. Побач з азотнатукавым заводам тут поўным ходам ідзе будаўніцтва буйнага завода па вытворчасці капралактама. Будоўля выйшла на стартавую прамую. Будаўнікоў змяняюць мантажнікі, мантажнікаў — эксплуатацыйнікі. Хутка на прадпрыемствы краіны пойдзе хімічная прадукцыя з маркай новага завода.
На здымку — устаноўка завода.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

За заслугі ў развіцці савецкага кінамастацтва Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў ганаровае званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР.



Лужаніну-Каратаю Аляксандру Амвросьевічу — галоўнаму рэдактару сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм».



Масальскаму Рыгору Ігнатавічу — кінааператару вытворча-творчага аб'яднання «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм».



Шульману Іосіфу Абрамавічу — рэжысёру-пастаноўшчыку кінастудыі «Беларусьфільм».

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці і прапагандзе савецкага кінамастацтва і ў сувязі з 50-годдзем савецкай кінематаграфіі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР:

Брузіля Натана Абрамавіча — галоўнага інжынера Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па кінематаграфіі.

Будаева Івана Уладзіміравіча — кіраўніка Мінскай абласной і гарадской канторы кінапракату.

Гнядко Мінну Іванаўну — кіраўніка Гродзенскай абласной канторы кінапракату.

Гуліс Клаўдзію Міхайлаўну — кінамеханіка Лагойскага раёна Мінскай вобласці.

Жаўлакова Міхаіла Іванавіча — намесніка начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення кінафікацыі.

Кананаву Валянціну Антонаўну — дырэктара Полацкага аддзялення кінапракату.

Люцко Фаіну Іванаўну — дырэктара кінатэатра «Піянер» г. Мінска.

Малахаву Лідзію Фёдараўну — дырэктара кінатэатра «Кастрычнік» г. Гомеля.

Арэхоўскага Мікалая Раманавіча — дырэктара кінатэатра «Перамога» г. Мінска.

Паўлоўскага Баляслава Карлавіча — дырэктара Мядзельскага галаўнога раённага кінатэатра Мінскай вобласці.

Пужэвіча Уладзіміра Андрэевіча — кінааператара кінастудыі «Беларусьфільм».

Сакалова Яўгена Паўлавіча — кінааператара кінастудыі «Беларусьфільм».

Сасніну Ніну Аляксандраўну — начальніка цэха апрацоўкі плёнкі кінастудыі «Беларусьфільм».

Цімановіча Сцяпана Адамавіча — дырэктара Столінскага галаўнога раённага кінатэатра Брэсцкай вобласці.

Граматай Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны:

Высеўка Уладзімір Іванавіч — тэхнарук кінатэатра «Цэнтральны» г. Мінска.

Галаўня Іван Уладзіміравіч — кінамеханік Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці.

Іванцоў Юрый Міхайлавіч — кінааператар кінастудыі «Беларусьфільм».

Карнаван Васіль Панцялеевіч — кінамеханік Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

Арлоў Венядзікт Аляксандравіч — кінааператар кінастудыі «Беларусьфільм».

Папкоў Мікалай Карпавіч — майстар кінарамонтнага пункта Кармянскага раёна Гомельскай вобласці.

Пруднікаў Леанід Нілавіч — электрамантажнік мінскага завода «Кінадэталь».

Псоцік Пётр Паўлавіч — кінамеханік Пінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Сямкоў Дзмітрый Рыгоравіч — дырэктар Сенненскага галаўнога раённага кінатэатра Віцебскай вобласці.

Соркін Тэвель Майсеевіч — дырэктар Старадарожскага галаўнога раённага кінатэатра Мінскай вобласці.

Яравая Ніна Ігнатаўна — кінамеханік кінатэатра «Радзіма» г. Мінска.

■

За заслугі ў падрыхтоўцы музычных кадраў і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння заслужаны артыст БССР, прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага тав. Бергер Міхаіл Аронавіч узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ЖНІВО — ПАРА ГАРАЧАЯ

На палях рэспублікі ў разгары жніво. Разам з працаўнікамі палёў у гэтай вялікай рабоце прымаюць актыўны ўдзел тысячы работнікаў культурнага фронту. На палявых станах, у клубах і чырвоных кутках многіх калгасаў і саўгасаў у гэтыя дні часта можна сустрэць артыстаў народных тэатраў, ансамбляў, агітбрыгад, якія выступаюць з канцэртамі.

Наш карэспандэнт звязаўся па тэлефоне з некаторымі раёнамі. Вось што яму расказалі.

АД БЯРЭЗІНЫ ДА НЁМАНА

БАРЫСАЎ. З гастрольнай паездкі вярнулася агітбрыгада гарадскога Дома культуры. Яна пабывала ў Нясвіжскім і Стаўбцоўскім раёнах, дзе дала шаснаццаць канцэртаў.

Усюды барысаўчан прымалі сардэчна. У іх праграме былі творы аб Леніне, аб Радзіме, песні беларускіх кампазітараў, танцы народаў СССР, сатырычныя нумары.

Члены агітбрыгады выступалі ў калгасных, саўгасных клубах, дамах культуры, на палявых станах і таках.

СТО КАНЦЭРТАЎ У ПОЛІ

БАРАНАВІЧЫ. «Мы славім працу хлебаробскіх рук» — так называецца тэматычная праграма, з якой у гэтыя дні выступаюць на калгасных палявых станах 35 агітбрыгад Баранавіцкага раёна. У іх уваходзяць самадзейныя артысты, кінамеханікі з кінапераўсоўкамі, лектары, паэты, самадзейныя кампазітары. Кожная агітбрыгада дала ўжо не менш трох канцэртаў.

ГОРАД — ВЁСЦЫ

МАЗЫР. Добра памагаюць хлебаробам у жніво самадзейныя артысты народнага ансамбля песні і танца трэста «Мазырсельбуд». Яны пабывалі з канцэртамі ў калгаснікаў Мазырскага, Акцябрскага, Ельскага, Петрыкаўскага і іншых раёнаў Палесся, далі больш трыццаці канцэртаў.

Дапамагаюць артысты народнага ансамбля і мясцовым самадзейным гурткам, выпускаюць насценныя газеты і баявыя лісткі, дзеляцца з сельскімі калектывамі сваім багатым рэпертуарам. А ён сапраўды багаты. У ім — беларускія, рускія, украінскія народныя песні і танцы, песні сучасных кампазітараў, харэаграфічныя сцэнкі.

НА МЯСЦОВЫХ ФАКТАХ

ЛІДА. На час жніва раённы аддзел культуры стварыў пяць агітбрыгад, якія амаль кожны дзень выступаюць перад калгаснікамі і рабочымі саўгасаў.

Цікавую праграму на мясцовых фактах стварылі ўдзельнікі самадзейнасці Мацівіцкага сельскага клуба. У частушках і куплетах яны адзначаюць перадавікоў жніва, лепшых арганізатараў, крытыкуюць гультаёў. Гэту праграму калгаснікі прымаюць вельмі цёпла.

Сельская агітбрыгада выступіла з канцэртам не толькі ў вёсках свайго калгаса, але пабывала і ў суседніх гаспадарках — «Нёман», «Гігант», «Беліца», «Сцяг Саветаў» і іншых.

ВЫСТУПАЕ НАРОДНЫ ТЭАТР

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Мясцовы народны тэатр папулярны не толькі ў сваім раёне, але і на ўсёй Міншчыне. У жніўні калектыў пабываў з выязным спектаклем па п'есе А. Афінагенава «Машанька» ў працаўнікоў палёў Дзяржынскага, Капыльскага і Уздзенскага раёнаў.

ЛЯТУЧЫ АГІТТЭАТР

ВІЛЕЙКА. У гэтыя дні на дарогах Вілейшчыны часта можна ўбачыць аўтамашыны, упрыгожаныя чырвонымі палотнішчамі. Гэта агітпоезд, які абслугоўвае працаўнікоў сяла. Ён быў арганізаваны ў першыя дні жніва. З вялікай цікавай праграмай — «У кожным сэрцы жывы і ўсюды з намі Ленін» артысты і аматары гэтага перасоўнага агіттэатра пабывалі ў саўгасах «Лукавец», «Карпавічы», «Ільянскі», «Вязынь», «Любань».

ВЫСТАЎКА Ў КАЛГАСЕ

Аб ажыццяўленні вялікіх ленінскіх ідэй, яго літаратурнай спадчыне, аб нашым сучасніку расказвае фотавыстаўка, якая адкрылася ў Доме культуры калгаса «17-га верасня» Валожынскага раёна. На ёй прадстаўлены работы фотаматараў свайго, а таксама суседніх — Маладзечанскага, Вілейскага і Мядзельскага раёнаў.

Па-майстэрску, з вялікім веданнем законаў фатаграфіі зроблены фотапартрэт М. Троіцкага — «Ён бачыў Ільіча», кампазіцыйныя здымкі К. Краўчанкі — «Гарыць лямпачка Ільіча», «Партызанскімі сцежкамі», а таксама работа П. Шахменкі — «Мы будзем дастойны старэйшага пакалення» і іншыя.

РЭДКАЯ ЗНАХОДКА

Пад час раскопак юныя краязнаўцы Жыцькаўскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна знайшлі унікальны медаль з адбіткам Уладзіміра Ільіча Леніна. Знаходка адносіцца да часоў грамадзянскай вайны і, мабыць, служыла ўзнагародай за ратныя подзвігі.

Краязнаўцам удалося ўстанавіць, што медаль была адліта ў 1919 годзе на Петраградскім манетным двары, а партрэт Уладзіміра Ільіча выкананы гравёрам Дзмітрыем Сцяпанавым.

ЛЕНІНСКІЯ ДЗЁННІКІ

Языльская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна завяла ленінскі дзённік добрых спраў. У яго запісваецца ўсё, што робіцца па прапагандзе ленінскай спадчыны: тэматычныя вечары, вусныя часопісы, кніжныя і плакатныя выстаўкі, канферэнцыі чытачоў. Кожнае мерапрыемства фатаграфуецца і з адпаведным подпісам наклейваецца ў ленінскі дзённік.

З вопытам Языльскай сельскай бібліятэкі азнаёміліся работнікі ўсіх бібліятэк раёна. Яны вырашылі таксама завесці ленінскія дзённікі добрых спраў, вынікі якіх будуць падведзены напярэдадні юбілею правадыра.

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ПРАВАДЫРУ

У клубе фабрыкі вытворча-абутковага аб'яднання «Прамень» адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе У. І. Леніна «Вялікі пачын», у якой прынялі ўдзел ветэраны прадпрыемства і маладыя абутнікі. Загадчыца бібліятэкі К. Каплан разам з чытацкім актывам арганізавала ў цэхах і зменах фабрыкі калектыўныя чытанні гэтай працы Леніна. Былі складзены рэкамендацыйныя спісы літаратуры ў дапамогу вывучаючым творы Ільіча.

На канферэнцыі выступілі інжынер Н. Бандарэнка, камсорг цэха Е. Назаравіч, работніца аддзела новай тэхнікі Л. Федар і іншыя. Прамоўцы гаварылі аб тым, як калектыў фабрыкі ажыццяўляе запаветы Ільіча. Звыш 500 рабочых прадпрыемства сталі на працоўную вахту ў гонар стагоддзя з дня нараджэння вялікага правадыра пралетарскай рэвалюцыі. Многія рабочыя працуюць ужо ў лік 1970 г.

Бібліятэкарка К. Каплан расказала аб тым, з якой вялікай цікавасцю чытаюць творы У. І. Леніна рабочыя фабрыкі. Электрык В. Тодараў, тэхнолаг Н. Дубовік, работніца П. Някрасава правялі ў цэхах гутаркі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці У. І. Леніна.

У клубе адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У ім прынялі ўдзел беларускія пісьменнікі М. Ткачоў і Е. Лось. Яны прачыталі новыя творы пра Леніна, падзяліліся сваімі творчымі планамі.

Цікавай была і канферэнцыя чытачоў па кнізе беларускага пісьменніка А. Савіцкага «Жанчына», у якой удзельнічаў і аўтар рамана.

Л. ФРЫД.



Віцебск. На ўзбярэжжы Заходняй Дзвіны ўзняліся многапавярховыя сучасныя дамы.
Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ПЕРАКЛІЧКА СЕЛЬСКІХ КЛУБАЎ

КАБ НЕ БЫЛО АЎРАЛАЎ

— Вас, пэўна, цікавіць наша «Лявоніха», або, як мы яшчэ называем гэты ансамбль — хор бабулек? Ён добра выступаў на заключным канцэрце рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці, і па тэлебачанні, — і метадысты Бярэзінскага раённага Дома культуры В. Ільюшчэнка і Р. Левін зноў пачалі расказваць мне пра вядомае—які гэта цудоўны калектыў. Потым пахваліліся і гарадской харавой капэлай, у якой некалькі дзесяткаў спевакоў, і наогул развіццём мастацкай самадзейнасці ў раёне.

Паслухаць іх — дык справы ідуць проста цудоўна, самадзейныя калектывы толькі і атрымліваюць дыпломы ды граматы.

Але прайдзіце сёння па адрасах гэтых калектываў і вы ўбачыце, што многія з іх існуюць толькі на паперы. Нават славутая Бярэзінская харавая капэла і «хор бабулек» — «Лявоніха» — перасталі выступаць. У Бярэзінскім раёне так павялося ўжо — аб самадзейных артыстах успамінаюць толькі перад аглядамі. Перад аглядамі пачынаецца сапраўдны аўрал. Рэпетыцыі ідуць поўным ходам.

А як бы добра было, каб работа вялася кругла год! Каб майстэрства калектываў мастацкай самадзейнасці шліфавалася няспынна, каб культурнае жыццё біла крыніцай.

— Няма каму кіраваць калектывамі. От каб сядзеў у кожным клубе загадчык са спецыяльнай адукацыяй...— гавораць у аддзеле культуры.

Безумоўна, калі б кіравалі самадзейнасцю спецыялісты — лепшага і не трэба б. А калі іх не хапае? Дык што, сядзець склаўшы рукі? А дзе работнікі раённага Дома культуры?

— Ведаеце, часам выязджаем у сельскія клубы, праводзім рэпетыцыі, — апраўдваюцца яны. —Калі канцэртная брыгада з Беразіно выязджае, то і мы з ёю. На месцы расказваем загадчыку клуба, як лепш арганізаваць работу...

На жаль, такія выезды бываюць вельмі рэдка. Не любяць метадысты ездзіць у вясковыя клубы. А каму ж як не людзям са спецыяльнай адукацыяй дапамагаць вясковым энтузіястам развіваць мастацкую самадзейнасць!

Праўда, адны толькі метадысты не выправяць становішча. Многае залежыць ад таго, хто загадвае вясковымі ўстановамі культуры.

У Бярэзінскім раёне дваццаць два сельскія клубы і два дамы культуры. І толькі два загадчыкі скончылі культасветвучылішчы, астатнія кіраўнікі клубаў—учарашнія школьнікі, людзі без падрыхтоўкі. Але і тут можна знайсці выйсце. Хіба нельга арганізаваць пры музычнай школе, якая ёсць у кожным раёне, скажам, курсы для кіраўнікоў самадзейнасці. Дарэчы, Міністэрства культуры выдала спецыяльную пастанову, у якой прапанавана пры дзіцячых музычных школах ствараць курсы калгасных баяністаў.

У Беразіно пакуль няма такіх курсаў, хоць патрэба ў іх вялікая. Няма не віне школы. Аднойчы сюды пазваніў старшыня калгаса імя XXII з'езда КПСС М. Дзенісевіч. Яго цікавілі ўмовы прыёму ў дзіцячую музычную школу дарослага чалавека. Гэты званок здзівіў і абрадаваў дырэктара Л. Амбросаву. І хоць на дварэ ўжо быў студзень, даўно пачаўся навучальны год, яна згадзілася прыняць пасланца гаспадаркі загадчыка клуба Івана Баразнёнка. Ён акуратна наведваў заняткі, а потым неяк сказаў: «На жаль, па сямейных абставінах не змагу вучыцца далей».

Так перасталі існаваць «курсы» калгасных баяністаў, бо не было слухачоў, хаця аб'явы аб прыёме друкаваліся ў раённай газеце і перадаваліся па мясцовым радыё. Аб гэтым Л. Амбросава не раз гаварыла і са старшынёй райвыканкома М. Душковым, і з загадчыкам раённага аддзела культуры М. Сакавым. «Напішыце праект пастановы,—параілі яны,—а мы прымем яго на пасяджэнні выканкома і разашлём старшыням калгасаў і дырэктарам саўгасаў».

Варта прыгадаць, што такое рашэнне прымалася райкомам партыі і райвыканкомам некалькі гадоў назад. Аднак яно, як бачыце, не выконваецца. А зноў прымаць такое рашэнне ўжо неяк і няёмка.

Чаму ж ніхто з кіраўнікоў не хоча накіроўваць людзей на курсы баяністаў? Няўжо яны супраць таго, каб загадчыкамі клубаў працавалі падрыхтаваныя людзі? Мы гутарылі з многімі з іх і што ж давялося пачуць? Адны разважаюць так: «У нас хапае гаспадарчых клопатаў. Аб загадчыках клубаў няхай дбаюць аддзел культуры ды сельскія Саветы. Гэта іх хлеб». Некаторыя старшыні калгасаў напрамкі адказваюць так: «Навучы чалавека за кошт гаспадаркі, а ён потым збяжыць... Не, няхай лепш будзе па-старому».

Вось так і замыкаецца кола. А чакаць, пакуль у раён прышлюць трэба дыпламаваных работнікаў, значыць, чакаць пакуль што нерэальнага.

Пакуль жа ўсё застаецца па-ранейшаму. Метадысты раённага Дома культуры, седзячы дома з захапленнем расказваюць аб поспехах самадзейных калектываў. Толькі поспехі гэтыя ўяўныя.

П. СІДАРОВІЧ.

АРХІТЭКТУРА

ТРАДЫЦЫІ І БУДУЧЫНЯ

Інтэрв'ю каля праектаў цэнтра Мінска

Нашы чытачы ведаюць аб выніках Усесаюзнага закрытага конкурсу на лепшае агульнае кампазіцыйнае вырашэнне і праект рэканструкцыі цэнтральнага раёна Мінска.

У конкурсе бралі ўдзел «Мінскпраект», «Белдзяржпраект», Цэнтральны навукова-даследчы інстытут горадабудаўніцтва (Масква) і Маскоўскі архітэктурны інстытут.

Якімі горадабудаўнічымі ідэямі ўзбагаціў дойлідаў конкурс? Як лепшыя ідэі будуць развівацца? Пра гэта карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» Кастусь Тарасаў гутарыў каля макетаў будучага цэнтра Мінска з членам журы конкурсу і з удзельнікам аўтарскага калектыву — пераможцы ў творчым спаборніцтве.

Першае інтэрв'ю — з начальнікам Упраўлення па справах будаўніцтва і архітэктуры выканкома Мінскага гарадскога Савета, членам журы конкурсу Віктарам Паўлавічам Чарнышовым.

— У конкурсе бралі ўдзел чатыры калектывы. Чым, на ваш погляд, характэрныя іх работы?

— Па-першае, падкрэсліваю: аналагічныя творчыя спаборніцтвы дойлідаў у апошнія гады праводзяцца для ўсіх вялікіх гарадоў краіны і рэспубліканскіх сталіц. Таму і аказалася такой невялікай колькасць праектных арганізацый — удзельніц нашага конкурсу. Зразумела, было б цікава паглядзець, як вырашылі б конкурснае заданне, скажам, дойліды Ленінграда або Вільнюса. Але яны заняты сваімі цэнтрамі. На мой погляд, перамога архітэктараў «Мінскпраекта» — не выпадковая. Гэты творчы калектыў бліжэй за ўсіх да вострых праблем Мінска і, у прыватнасці, яго цэнтра. Мінскпраектаўцы ведаюць гэтыя праблемы, як кажуць, у развіцці, і пастараліся вырашыць іх у конкурсным праекце аптымальна. Зрэшты, ступенню пранікнення ў рэальныя патрэбы Мінска прадвызначана ступень жыццёвасці прапанаваных ідэй. Архітэктары «Белдзяржпраекта» таксама ведаюць мінскія праблемы. У іх праекце — нямала цікавых рашэнняў. Маскоўскія калектывы за кароткі тэрмін не здолелі дастаткова паглыбіцца ў мінскую спецыфіку — таму і рашэнні іх больш абстрактныя...

— А ў чым канкрэтна гэтая абстрактнасць?

— Мінск мае свае архітэктурныя традыцыі — даўнія, трывалыя, а галоўнае — добрыя. Зыходзячы з іх, мы мяркуем, што ў цэнтральнай частцы радыкальныя змены функцый асобных раёнаў былі б ненатуральныя. Абсалютна немэтазгодна мяняць усталяваныя за дзесяцігоддзі ўяўленні аб вуліцах, плошчах, асобных кварталах. Цэнтр горада не патрабуе карэннай перабудовы. Якраз таму знешнія рашэнні, хаця яны і прыгожыя, прыняць цяжка. Так, напрыклад, у праектах маскоўскіх дойлідаў прапанавана вынесці за межы гарадскога цэнтра ўсе прамысловыя прадпрыемствы. Канечне, гэта вельмі пажадана. Але ж мы не маем права не браць у разлік эканоміку: завод са складанай тэхналогіяй вытворчасці пры пераездзе на некалькі гадоў выключаецца на наладку.

— А якія, Віктар Паўлавіч, галоўныя вартасці работы мінскпраектаўцаў?

— Мне вельмі па душы рашэнне транспартных магістраляў. З гэтай справай у нас і цяпер складана, а гадоў праз 10—20, калі горад вырасце амаль удвая, транспартная праблема можа стаць самай балючай. Тут вельмі важна загадзя ведаць свае перспектыўныя магчымасці і мець пад рукой больш-менш выразныя распрацоўкі, каб па лініях будучых магістраляў і пешаходных эспланад своечасова забараніць рознае будаўніцтва. Самая ж істотная вартасць праекта — яго рэальнасць. Улічаны будаўнічыя магчымасці горада. Праяўлены максімум павагі да забудовы мінулых гадоў. Карацей кажучы, прынцып праекта — мэтазгоднасць і зручнасць.

— Ці азначае перамога мінскпраектаўцаў адмаўленне ад ідэй іншых калектываў?

— Не, не азначае. Неўзабаве будзе створана група, якая пачне дэталёвую распрацоўку праекта і, натуральна, уважліва прааналізуе ўсе здабыткі конкурсу. Мяркую што ўдалыя рашэнні, незалежна ад таго, хто іх аўтар, будуць сабраны ў адно. А цікавых прапаноў і ў іншых, і ў маскоўскіх праектах— дастаткова!.. Таму, мне здаецца, у групу архітэктараў, якія возьмуцца за распрацоўку праекта новага цэнтра Мінска, увойдуць і мінскпраектаўцы, і белдзяржпраектаўцы.

— Вы, мабыць, лепш за ўсіх ведаеце планы будаўніцтва ў горадзе. Што з прапаноў дойлідаў будзе ажыццёўлена ў бліжэйшыя гады?

— Праект разлічаны на перспектыву ў 30 гадоў. Мы ж можам гаварыць дакладна пра будаўніцтва на бліжэйшыя гадоў пяць, менш дакладна — на дзесяцігоддзе, а далей ужо — адны мары... Прадказаць, што будзе ў цэнтры горада будавацца гадоў, скажам, праз 15, — амаль немагчыма. А што датычыць бліжэйшай пяцігодкі, дык завершацца намечанае будаўніцтва на Паркавай магістралі, рэканструкцыя вуліцы Нямігі і Ульянаўскай. Забудуюцца ўсе ўезды ў горад.

— А як вы самі ставіцеся да аблічча Мінска канца стагоддзя, намаляванага ўяўленнем дойлідаў?

— Сённяшні Мінск мне падабаецца. Наколькі можна меркаваць паводле макета, ён стане яшчэ прыгажэйшы.

Мы вядзём гэтую гаворку, калі набліжаецца год 1970. А на макеце — цэнтр Мінска канца стагоддзя. Многае абазначана ўмоўна. Адразу цяжка разабрацца, што гадоў праз дваццаць пяць знікне, а што застанецца, дзе вырастуць новыя будынкі, стадыёны, скверы, з'явяцца падвесныя дарогі. Пракаменціраваць макет згадзіўся адзін з аўтараў лепшага праекта — кіраўнік майстэрні генеральнага плана «Мінскпраекта» Яўген Канстанцінавіч Дзятлаў. **Першае пытанне да яго было аб прадпасылках рашэнняў, якія ў аснове праекта.**

— Мы зыходзілі з таго, што цэнтральны раён Мінска павінен мець архітэктурныя ансамблі рэспубліканскага і гарадскога значэння. Ядро цэнтра за пасляваенныя гады атрымала здаровую аснову — яго трэба не мяняць, а толькі развіваць. Што перш за ўсё патрабуе тут развіцця? Ленінскі праспект перагружаны рухам і з'яўляецца транзітнай транспартнай магістраллю. У цэнтры горада універсітэт і некалькі буйных інстытутаў не маюць плошчы для росту. Многія ўстановы займаюць непрыстасаваныя для іх памяшканні. Літаральна ў цэнтры горада ёсць цэлыя раёны з устарэлымі, малакаштоўнымі дамамі. Тут стыхійна склалася значная сетка заводаў і фабрык, дробных прадпрыемстваў і гаражоў. Няма месцаў для аўтастаянак. Некаторыя кварталы не азелянёны. Вось мы і пастараліся, улічваючы ўсе гэтыя акалічнасці, знайсці аптымальныя рашэнні праблем. Пры гэтым імкнуліся рэалістычна ацэньваць нашы будаўнічыя магчымасці. Наша задача была — арыентавацца не на далёкіх нашчадкаў, а на цяперашнія пакаленні. Паэтапнае завяршэнне асноўных ансамбляў цэнтра прадугледжана ў межах да 2000 года.

— Назавіце, калі ласка, галоўныя аб'екты будучага цэнтра.

— Палац культуры, Дом народнай творчасці, Дзяржаўны музей БССР, Музей горадабудаўніцтва і архітэктуры, тэатр музычнай камедыі, панарамны кінатэатр, музей выяўленчага мастацтва, новы комплекс Палаца піянераў, Дзяржаўная бібліятэка, кінаканцэртная зала на 1 500 месц, Дом творчых арганізацый, некалькі гасцініц, адна з іх — на беразе Свіслачы, на 2 000 месц. Ну, яшчэ — універмагі...

— Дарэчы, а якія межы цэнтральнай часткі горада?

— Цяпер цэнтр мае два дыяметральна процілеглыя напрамкі планіровачнага развіцця: адзін — па Ленінскім праспекце, другі — уздоўж маляўнічай поймы Свіслачы ад парку Перамогі да Магілёўскай шашы. Вось у гэтых межах і выдзелены функцыянальныя зоны: адміністрацыйна-дзелавая, культурна-асветная і ўстаноў мастацтва, спартыўная, паркавая, вытворча-камунальная і жыллёвая. Жорсткага раздзялення іх наш праект не прадугледжвае.

— На макеце відаць, што на Цэнтральнай плошчы задуманы небаскробы. Якое іх прызначэнне?

— У нас грамадскі цэнтр горада і цяпер і ў перспектыве супадае з геаметрычным. Ён — на Цэнтральнай плошчы. Тут — будынак ЦК КПБ. Тут адзначаюцца ўсе святочныя падзеі. У той жа час гэтая плошча — і цэнтр адміністрацыйна-дзелавой зоны. Мы маем на мэце ўзмацніць сталічнае значэнне Цэнтральнай плошчы, размясціўшы тут будынак Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР. Ён стане якраз насупраць будынка ЦК, а небаскробы — за гэтым новым будынкам. Яны задуманы вышынёю паверхаў у сорак — як архітэктурная дамінанта цэнтра — і прызначаюцца для адміністрацыйных устаноў. Менш пераменіцца знешняе аблічча плошчы імя Леніна. Тут сканцэнтруюцца буйнымі комплексамі адміністрацыйна-дзелавыя ўстановы. Таму з часам адсюль будуць вынесены педагагічны і медыцынскі інстытуты, а таксама універсітэт. Пойдуць пад знос асобныя будынкі, якія не маюць каштоўнасці.

— А ёсць у нас яшчэ славутая плошча Свабоды. Якія змены адбудуцца на ёй?

— Плошча Свабоды вырашаецца ў адзіным комплексе з Цэнтральнаю, але належыць другой функцыянальнай зоне. *Яна ператворыцца ў плошчу* тэатральную. Тут мэтазгодна размясціць тэатр імя Янкі Купалы, Дом культуры...

— Вы гаварылі аб развіцці цэнтра ўздоўж Свіслачы. Як канкрэтна будзе яно ажыццяўляцца?

— Ну, па-першае, гэта не так ужо і прама ўздоўж Свіслачы. Перпендыкулярна Ленінскаму праспекту праходзіць дыяметр Паркавай магістралі. Як асноўны элемент кампазіцыі цэнтра, ён дае магчымасці для стварэння якасна новых архітэктурных ансамбляў узбуйненага маштабу. Будуць упісаны ў гэты рэльеф і архітэктурна звязаны з ракой комплекс Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, музычна-выставачны комплекс, Палац піянераў. У гэтай жа зоне знаходзяцца Тэатр оперы і балета, Палац прафсаюзаў, цырк, спартыўны комплекс «Дынама». Тут жа будзе і некалькі вялізных гасцініц.

— Паркавая магістраль актыўна набывае значэнне другой вуліцы горада. Якія змены будуць у прылягаючым да яе раёне?

— Забудова Паркавай магістралі — фон поймы Свіслачы. Яна вырашаецца як шматпланавая кампазіцыя з улікам пагоркавага рэльефу ў бок Юбілейнай плошчы. Патрэба мець транспартнага дублёра Ленінскага праспекта адаб'ецца і на Нямізе. Яна будзе пашырана. На адным баку Нямігі стануць шматпавярховыя будынкі, па другім — грамадскія і камунальныя ўстановы —універмаг, магазін аўтамабіляў, кінаканцэртная зала, гасцініцы. Участак вуліцы Астроўскага ад пачатку да Юбілейнай плошчы мяркуем пакінуць без змен.

— Гэты «кавалак вуліцы» пакідаецца, так сказаць, на памяць пра мінулы Мінск?

— Так. У Мінску ж зусім бедна з архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі. Застануцца дзве царквы і, як бачыце, некаторыя асобныя старыя будынкі. Захаваем на сваім месцы будынак тэатра імя Янкі Купалы, хаця ён і займае рог сквера і архітэктурна ні з чым не звязаны. У цяперашнім выглядзе застануцца і вуліцы Карла Маркса і Кірава. Яны маюць разнабаковую сетку абслугоўвання.

— Мікрараёны, якія акружылі цэнтр, узмацнілі ўражанне, што Мінск у асноўным роўны горад — і па рэльефе, і па дахах. Якім шляхам ліквідаваць гэты недахоп прапануе праект?

— Асноўная ідэя праекта якраз і заключалася ў вызначэнні дамініруючых будынкаў у гарадскім сілуэце. У цэнтры яны будуць дасягаць 16—24 паверхаў і нават 40, як я ўжо казаў. З імі згарманізуюцца будынкі меншыя, пастаўленыя па агульнагарадской магістралі і ў асобных ансамблях. Разнастаяцца і новыя жылыя фарміраванні на месцы вуліц Нямігі, Мяснікова, Розы Люксембург, Клары Цэткін, Пуліхава, Захарава, Першамайскай.

— У цэнтры шмат прамысловых прадпрыемстваў. Некаторыя з іх займаюць «зайздросныя» мясціны. Ці будуць яны вынесены на ўскраіны?

— Не, мы так не думаем. Вытворчыя комплексы ў цэнтры захоўваюцца. Канечне, не ўсе. Застануцца заводы імя Кірава і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, абутковая фабрыка, хлебазавод «Аўтамат» і некаторыя іншыя. Мы разглядалі пытанне, зыходзячы з рэальных магчымасцей. Прадпрыемствы, якія я назваў, — не шкодныя. У апошнія гады яны пабудавалі новыя карпусы, рэканструявалі цэхі, добраўпарадкаваліся. Пераносіць іх дзеля таго толькі, каб вызваліць тэрыторыю, — немэтазгодна. Да таго ж такія заводы, як імя Кірава і імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, — самыя старыя ў горадзе, яны былі кузняй мінскага пралетарыяту, далі стойкіх байцоў рэвалюцыі. Вось і гэта трэба ўлічваць. Іншая справа, што многае ў названых вытворчых комплексах патрабуе пэўных архітэктурных змен. Магчыма, патрэбны нейкія архітэктурныя прыкрыцці, але гэта ўжо — рабочае пытанне

— Горад расце і пастаянна адчувае патрэбу ў новых спартыўных збудаваннях буйнога маштабу. Што прапануе праект спартсменам і аматарам спорту?

— Спартыўная зона ў планіровачным рашэнні аб'яднана з паркавай. Гэта натуральна. Яна пачынаецца ад Цэнтральнага парку культуры і адпачынку «Перамога» і ідзе ўздоўж ракі да стадыёна «Дынама», які мяркуем рэканструяваць (тут будзе закрытая спартыўная арэна). Новы спартыўны цэнтр гарадскога значэння намечаны ў раёне Драздоўскага вадасховішча.

— Я бачу на макеце пад'ёмныя ўезды, пуцеправоды. Раскажыце, калі ласка, пра іх.

— Так, транспарт — гэта праблема праблем. Цяпер у Мінску вулічная сетка перанапружана — рух у два разы перавышае норму. Асноўны паток прыпадае на Ленінскі праспект. Няма арганізаваных аўтастаянак, дакладней — пляцовак для іх. Няма і пераходаў на розных узроўнях. Што ж мы прапануем? Магістралі па вуліцах Мяснікова, Янкі Купалы, Максіма Горкага, Нямізе, Свярдлова—своеасаблівае кальцо, якое дазваляе адмяжоўваць цэнтральную зону ад транспартнага транзіту. Участак Ленінскага праспекта ад плошчы Леніна да вуліцы Янкі Купалы аддаецца пешаходам. Для руху транспарту пад праспектам будзе прабіты тунель. У тунелях прадугледжваюцца і трасы дублёраў Ленінскага праспекта па вуліцах Мяснікова, Інтэрнацыянальнай і Кірава. Мяркуецца стварэнне пешаходнай эспланады на ўчастку ад Палаца спорту да выхаду на Магілёўскую шашу. На плошчы Свабоды пешаходны рух будзе на верхнім узроўні, на спецыяльных платформах. Раздзельны рух транспарту і пешаходаў прадугледжаны на Прывакзальнай плошчы. Тут мы мяркуем аўтамабільны рух пусціць пад зямлю. Трэцім узроўнем руху ў Мінску стане метрапалітэн. Падземныя памяшканні будуць і на плошчы Леніна. Тут задумана аўтамабільная стаянка на паўтысячы машын.

— І апошняе пытанне, Яўген Канстанцінавіч: ваша думка аб іншых праектах?

— Скажу коратка. Праекты цікавыя. Нямала змястоўных рашэнняў планіроўкі, ансамбляў. Не падлягае сумненню іх высокая архітэктурная культура.

УСЕСАЮЗНЫ СЕМІНАР СЕЛЬСКІХ ПРАПАГАНДЫСТАЎ КНІГІ

Учора ў Мінску закончыў работу трохдзённы Усесаюзны семінар работнікаў кніжнага гандлю спажывецкай кааперацыі. Ён быў прысвечаны прапагандзе ленінскіх твораў, паляпшэнню кніжнага гандлю на сяле і абмену вопытам работы сельскіх кааператараў па рэалізацыі літаратуры.

У семінары прынялі ўдзел прадстаўнікі кніжнага гандлю спажывецкай кааперацыі Беларусі, Расійскай Федэрацыі, Украіны, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Кіргізіі, Казахстана і іншых братніх рэспублік.

Наша сталіца абрана месцам збору сельскіх прапагандыстаў кнігі не выпадкова. Мінскі аблспажыўсаюз — адзін з перадавых у краіне па развіцці і пастаноўцы кніжнага гандлю.

На семінары з дакладам аб задачах кааператараў па стварэнні спецыялізаваных гаспадарча-разліковых кнігагандлюючых арганізацый выступіў намеснік начальніка Упраўлення арганізацыі гандлю Цэнтрасаюза В. Сёмушкін.

Пра выданне твораў У. І. Леніна і літаратуры, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння правадыра расказаў начальнік аддзела грамадска-палітычнай літаратуры Усесаюзнага аб'яднання кніжнага гандлю В. Казлоў.

Старшыня Мінскага аблспажыўсаюза Г. Жураўскі падзяліўся вопытам работы гаспадарча-разліковага аб'яднання кніжнага гандлю.

Удзельнікі Усесаюзнага семінара работнікаў кнігагандлю спажывецкай кааперацыі азнаёміліся з выдатнасцямі Мінска, наведалі Курган славы і мемарыяльны комплекс—помнік ахвярам фашызму Хатынь.

С. ВАНІН.

З пошты ЛіМа

ПАТРЭБНА ДАПАМОГА

Кіно даўно трывала ўвайшло ў наша жыццё. Яно стала настолькі папулярным, што многія яго прыхільнікі ўжо не могуць змірыцца толькі з роляй гледача, яны самі бяруць у рукі кінакамеру і здымаюць фільмы. Такім чынам у вялікага кінематографа з'явіўся малодшы брат — аматарскае кіно.

Аматарская студыя, што гэта такое? Як яе арганізаваць на прадпрыемстве, у палацы культуры, школе, калгасе.

Прафесіянальная кінастудыя — гэта дзяржаўнае прадпрыемства з вялікім штатам творчых і тэхнічных работнікаў, кіраўнічым апаратам і вялікім фінансавым бюджэтам. Аматарская ж кінастудыя — гэта таксама кінастудыя, але ў мініяцюры. Нельга зняць фільм без сцэнарнай задумы. Нельга зрабіць фільм без праяўлення плёнкі. І, нарэшце, фільм павінен быць агучаны. Глядач хоча бачыць на экране добры адбітак, чуць гук і музыку, як і ў прафесіянальным кіно. Адным словам, аматарскі фільм, як і прафесіянальны, павінен прайсці ўсе творчыя і тэхналагічныя працэсы.

Але дзе ўзяць дарагое, як на прафесіянальнай кінастудыі, абсталяванне? Ці пад сілу гэта маленькаму прадпрыемству або школе? Адкуль запрасіць спецыялістаў?

Працуючы кіраўніком аматарскай кінастудыі пры Палацы культуры Мінскага ордэна Леніна трактарнага завода, мне давялося непасрэдна сутыкнуцца з гэтымі праблемамі.

Арганізацыя аматарскай кінастудыі патрабуе вялікіх грашовых выдаткаў. Гэта, вядома, часта не пад сілу не толькі маленькім прадпрыемствам, але і такім гігантам, як Мінскі аўтамабільны і трактарны заводы. Скажу прама — і не трэба выдаткоўваць такія грошы. Трэба ўскласці на Белсаўпроф абавязкі арганізацыі адзінай у рэспубліцы кіналабараторыі, якая здолела б забяспечыць патрэбы ўсіх аматарскіх кінастудый.

***Патрэбна і дапамога тэлебачання,* на базе якога мы маглі б цэнтралізаваць усю работу аматарскіх кінастудый. Да таго ж кінааматары атрымаюць вялікі «рынак збыту» для сваіх твораў. Усё гэта будзе вялікім маральным стымулам у іх творчасці.**

Сёння ў час у рэспубліцы больш як 80 кінастудый і тысячы аматараў-адзіночак, якія чакаюць адкрыцця кіналабараторыі. Арганізацыя такога цэнтра становіцца справай надзённай.

М. НЯДБАЙЛА,
кіраўнік аматарскай кінастудыі пры Доме культуры МТЗ.

СВОЙ ГОЛАС, СВОЙ СТЫЛЬ

Валянціну ЦІХАНОВІЧУ — 60 ГАДОЎ

У 1934 ГОДЗЕ наведвальнікі выстаўкі кніжнай графікі ў Мінску ўбачылі новае прозвішча — Валянцін Ціхановіч. Ілюстраваць кнігі мастак пачаў яшчэ на другім курсе Віцебскага мастацкага тэхнікума каля чатырох дзесяткаў гадоў назад.

За дзесяцігоддзі напружанай працы створана нямала—і ў кніжнай графіцы, і ў сатырычнай. Былі на першых часах нават жывапісныя працы, якія таксама карысталіся поспехам. Так, напрыклад, на выстаўцы выяўленчага мастацтва Беларускай ССР на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 годзе В. Ціхановіч быў прадстаўлены не толькі кніжнай ілюстрацыяй («Белалобы» А. Чэхава), але і жывапісным пейзажам «Домік над ракой», які набыла Дзяржаўная карцінная галерэя БССР.

Валянцін Мікалаевіч кажа, што яго падштурхнула ў дзяцінстве да фарбаў матухна-прырода. Ён ведае жыццё роднай прыроды да драбніц, умее аналізаваць яе, вылучаць самае істотнае. І калі мы прыгадаем, напрыклад, малюнкі да чэхаўскага «Белалобага», да някрасаўскага «Генерала Таптыгіна», да бядулевай «Мурашкі-Палашкі», да народных казак, дык пераканаемся, што, «ачалавечваючы» звяроў, птушак і іншых персанажаў, мастак не адступае ад іх чыста прыроднай сутнасці.

Асабліва адчуваем мы гэта ў яго ілюстрацыях да кніжак Віталя Вольскага «На бабровых азёрах», «У лясах над Бярозай», «Каляндар роднай прыроды» — мастак надаў гэтым выданням непаўторнае аблічча, тактоўна дапаўняючы тэкст вельмі сціплымі, але багатымі на «інфармацыю» малюнкамі.

Сярод ілюстраваных В. Ціхановічам кніжак—«Здарэнне з Яўсейкам» М. Горкага, «Нашы птушкі» А. Гурло, «Жаба-падарожніца» У. Гаршына, «Хто чым пяе» В. Біянкі, «Дзед і мядзведзь» Я. Коласа, «Хвядос — чырвоны нос» К. Крапівы, «Хлопчык і лётчык» Я. Купалы, беларускія казкі...

А калі б сабраць шматлікія яго сатырычныя малюнкі на міжнародныя і ўнутраныя тэмы—яны склалі б не адну цікавую, змястоўную экспазіцыю. Лепшыя з сатырычных малюнкаў мастака ўваходзілі ў калектыўныя выстаўкі работ нашых мастакоў-сатырыкаў, а таксама ў індывідуальныя, аўтарскія. У 1944 годзе В. Ціхановіч працаваў у «Вокнах БЕЛТА». З самага заснавання «Вожыка» ў часопісе друкуюцца дасціпныя, вострыя карыкатуры мастака. А яшчэ грамадская работа — сатырычныя лісты і сяброўскія шаржы, якія ствараюцца ў часе розных канферэнцый, сходаў і г. д. Сатыра В. Ціхановіча папулярная. Яго работы змяшчаюць, апрача «Вожыка», «Крокодил», «Огонек», «Веселые картинки», «Перець», сатырычныя часопісы Польшчы, Балгарыі, Румыніі...

Творча неспакойны чалавек, ён працуе і як літаратар. Чытачам

палюбіліся яго кніжкі «Са стрэльбай і вудай», «Вузялкі на памяць», апавяданні і эсэ ў беларускай перыёдыцы.

Мастак многа, напружана працуе і ў апошні час. Нядаўна чытачы атрымалі аформленыя ім кніжкі Астапа Вішні «Усмешкі» і Я. Зазекі «Сонечны алень». Задумана вялікая серыя графічных лістоў аб плане ГАЭЛРО ў дзеянні—своеасаблівае графічнае апавяданне аб беларускіх гідраэлектрастанцыях.

У майстэрні мастака я пабачыў шматлікія эскізы ілюстрацый да сусветна вядомых народных казак «Рэпка» і «Гусі-лебедзі». Гэта будуць каляровыя літаграфіі. Для дзяцей мастакі ствараюць серыю лістоў на тэмы славутых казак. Два з іх робіць В. Ціхановіч. Усю разнастайнасць вобразнага ладу казкі трэба перадаць у адным лісце. Гэта нялёгка. Таму і мноства эскізаў. Але такая ўжо завядзёнка ў Валянціна Ціхановіча. Які б малюнак ні ствараўся—да кожнага літаральна горы эскізаў.

І яшчэ—планы літаратурныя. Сабралася каля двух дзесяткаў неапублікаваных апавяданняў. Аўтар мае намер стварыць новую кніжку. І яшчэ—кніжку пра рыбалку. Тут будуць апавяданні, замалёўкі, а да іх—як каментарый—навуковыя звесткі для аматараў рыбнай лоўлі.

У выяўленчым мастацтве ён раўняецца на Елісеева, Кукрыніксаў. У літаратуры—на Прышвіна, Біянкі, Сакалова-Мікітава. І, мабыць, таму, што творча спаборнічае з такімі талентамі,—ён мае свой непаўторны стыль, почырк, свой голас.

Ул. БОЙКА.

АБМЕННЫЯ КАНЦЭРТЫ

Няблага наладжаны на Магілёўшчыне абмен вопытам і дасягненнямі ў рабоце самадзейных калектываў. Яны часта ездзяць са справаздачнымі канцэртамі адзін да аднаго.

Такі канцэрт днямі адбыўся ў Асіповіцкім раёне. Сюды ў госці прыехалі аматары самадзейнай сцэны Быхаўскага раённага Дома культуры.

Пераважала ў праграме сучасная эстрадная песня. Выконваліся таксама танцы, сатырычныя частушкі і народныя песні.

Гледачы цёпла прынялі выступленне спявачак А. Каліноўскай, М. Міронавай, Н. Мяркулавай.

Неўзабаве з абменным канцэртам у Быхаў прыедуць самадзейныя артысты з Асіповіч.

Ф. САГАНОВІЧ.

У КРЭПАСЦІ-ГЕРОІ

Водгукі прадстаўнікоў усіх братніх рэспублік нашай краіны і многіх зарубежных дзяржаў можна прачытаць у кнізе ўліку наведвальнікаў гераічнай Брэсцкай крэпасці. Толькі ў гэтым месяцы тут пабывалі маладыя пасланцы В'етнама і студэнты універсітэта імя Патрыса Лумумбы, госці з Польшчы і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, а таксама турысты з Расійскай Федэрацыі, Украіны, Узбекістана. Толькі за адзін мінулы дзень у цытадэлі над Бугам пабывала больш пяці тысяч наведвальнікаў.

У гэтыя дні фонды музея крэпасці папоўніліся яшчэ адным цікавым экспанатам. З Зорнага гарадка, дзе жывуць савецкія касманаўты, у крэпасць-герой дасланы макет ракеты з зямлёй касмадрома Байканур, адкуль стартаваў у сусвет першы касманаўт Юрый Гагарын.

Супрацоўнікі музея перадалі касманаўтам Зорнага гарадка макет Холмскіх варот з зямлёй цытадэлі, а таксама альбом з аўтографамі яе абаронцаў.

НАВІНКІ КНІЖНАЙ ГРАФІКІ

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь»: С. Антонаў «Старэйшы», Ул. Нядзведскі «Сыны Кастрычніка», В. Вольскі «Пад небам Афрыкі», А. Марціновіч «Нанцюрн».

СТАРОНКІ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭТЫЧНАЙ ЛЕНІНІЯНЫ

100

ПРА НАЙВЯЛІКШАЕ Ў СВЕЦЕ ЖЫЦЦЁ

Ул. Гніламёдаў

ЛЕНІНСКАЯ тэма і неадрыўная ад яе тэма партыі, рэвалюцыі, народа даўно стала традыцыйнай і адной з цэнтральных у беларускай савецкай паэзіі. Па ёй можна з поўнай падставай меркаваць не толькі аб узроўні палітычнай свядомасці нашых паэтаў, але і аб тых складаных шляхах, якія прайшла савецкая паэзія ў сваім мастацкім развіцці больш як за 50 год сваёй гісторыі.

Цяжка нават пералічыць імёны паэтаў, якія бралі ўдзел у стварэнні беларускай паэтычнай Лeнініяны. Зм. Бядуля і Я. Колас, П. Трус і А. Дудар, П. Глебка і М. Лужанін, П. Броўка і М. Танк, А. Куляшоў і П. Панчанка, С. Дзяргай і А. Вярцінскі — гэтыя і шмат якія іншыя нашы паэты аддалі даніну любві і павагі вялікаму правадыру працоўных свету.

Да ленінскага вобразу не раз звяртаўся ў сваёй творчасці А. Вялюгін. У жыцці і дзейнасці Уладзіміра Ільіча паэту адразу ўбачыліся вытокі тых рэвалюцыйных традыцый, якія аб'ядналі пакаленні савецкіх людзей, пакаленні барацьбітоў-ленінцаў адзінаю воляй, адзіным імкненнем на шляху сацыялістычнай рэвалюцыі.

Гэтая сувязь пакаленняў, змацаваная традыцыямі абароны рэвалюцыйных заваёў, выразна прасочваецца ўжо ў вершы А. Вялюгіна «Пасведчанне» (1952). У штабе рэвалюцыі Смольным «у дзень абвяшчэння свабоды» Уладзімір Ільіч уручае матросу Лявону Лагодзе пасведчанне камендатуры:

Тады правадыр вартавому
сказаў,
Як сыну:
— Таварыш Лагода,
Важнейшая справа між
сённяшніх спраў —
Здабытая намі свабода.
Змагацца яшчэ нам не дзень і не
год.
Патрэбна надзейная варта.
Я знаю. вы будзеце ў часе нягод
Даверу народнага варты...

Ленінскія словы аб «здабытай намі свабодзе» перадаюцца ад бацькі да сына, ад сына да ўнука, як наказ бараніць ад ворагаў заваёвы Кастрычніка.

Адно з бязумоўна буйнейшых дасягненняў сучаснай беларускай паэтычнай Лeнініяны — паэма А. Вялюгіна «Вецер з Волгі». У ёй паэт звярнуўся да «вытокаў найвялікшага ў свеце жыцця», да маленства і юнацтва Уладзіміра Ульянава. «Ленін пачынаўся, як пачынаецца магутная Волга.., — піша А. Вялюгін у прадмове да паэмы. — У неспакойным юнаку — гімназісце мне адразу пабачыўся арганізатар Кастрычніцкага штурму». І сапраўды: менавіта такім паўстае Уладзімір Ульянаў у паэме А. Вялюгіна. Галоўныя рысы характару Леніна — чалавека і рэвалюцыянера — акрэсліліся тут, на беразе Волгі, якая нібыта ўвабрала ў сябе боль, тугу, мары і спадзяванні ўсяго народа:

Рассінелася круча,
адкуль
па-арлінаму
глянуў
яснавокі,
картавы —
не такі, як усе.
быў такі, як усе.
Сціплы,
шчыры як праўда,
вялікі і просты,
як радасць
пачынаецца Ленін.
нібы Волга ў глушы...

Звяртаючыся да ленінскай тэмы, беларуская паэзія заўсёды выказвала сваю любоў да правадыра, вернасць ленінскім запаветам, сваю ўпэўненасць, што ідэі Леніна былі, ёсць і будуць асновай дзейнасці партыі і нашага народу, сцягам барацьбы за камунізм, пафасам дваццатага стагоддзя.

Ленінская тэма — гэта тэма дваццатага стагоддзя, яго шляхоў і сацыяльных перспектыў. «Няма ніводнай колькі-небудзь значнай для чалавецтва падзеі, — гаварыў вядомы дацкі пісьменнік-камуніст Марцін Андэрсен-Нексе, — якая не была б звязана з Леніным і рэвалюцыяй».

Калі чытаеш творы аб Леніне, нязменна думаеш пра вялікую маральную адказнасць мастака, які звяртаецца да ленінскага вобраза, перад гістарычнай ісцінай. Чаго працей, напрыклад, пераказаць эпізод з біяграфіі, расчуліцца чалавечай прастатою і дэмакратызмам Ільіча. Да гонару беларускіх паэтаў, яны ў мастацкім вырашэнні ленінскай тэмы пазбягалі такога, лёгкага шляху. Мастацкі ўзровень асэнсавання вобраза Леніна ўзнімаўся адпаведна з мерай творчай сталасці беларускай паэзіі.

Наша крытыка ўвогуле станоўча ацаніла паэму А. Вялюгіна, і нельга не далучыцца да такой ацэнкі. Хочацца аднак яшчэ раз падумаць над тым, у чым караніцца прынцыповая мастацкая ўдача паэта, чым яе можна вытлумачыць, што ў ёй павучальнага.

Паэме пра У. І. Леніна А. Вялюгін аддаў некалькі год настойлівай творчай працы. Ён грунтоўна вывучаў успаміны пра Леніна, не раз пабываў ва Ульянаўску, хадзіў Ільічовымі сцежкамі, дыхаў волжскім паветрам, яшчэ і яшчэ раз удумваўся ў факты ленінскага жыцця, у побыт сям'і Ульянавых, мысленна «ўжываўся» ў асяроддзе, якое акружала Леніна-юнака.

Жыццё Уладзіміра Ільіча, яго біяграфія, здавалася б, добра вядомыя нам, аднак, пераказаныя паэтам, яны не перастаюць хваляваць. Пры гэтым А. Вялюгін шчодра выкарыстаў права мастака выбраць галоўнае, найбольш тыповае і важнае для сваёй паэтычнай задумы. Адчуваецца, што паэт кіраваўся менавіта такім імкненнем, калі расказаў пра ўцёкі з-пад стражы качагара Фадзеева (раздзел «Як пахне воля») або пра пошукі таемнага ходу ў склеп, дзе некалькі дзён у драўлянай клетцы прасядзеў Пугачоў («Таемны ход»). Гэтыя і іншыя моманты ўзнаўляюць свет духоўных інтарэсаў, сярод якіх раслі гімназісты. Нам блізкая і зразумелая цікавасць Валодзі Ульянава і яго сяброў да асобы Пугачова, якім ён прадстае ў размове з Паніным. Сябар Валодзі малады Апалон Карынфскі дэкламуе маналог Пугачова:

«— Варанчук я, а не воран!
Воран скора прыляціць.
Будзе ён, ад помсты чоран,
Кодла сытае судзіць...
Па мужыцкай спіне лясне
Твой бізун яшчэ не раз.
Не ў такой крывавай лазні
Будзеш мыцца — прыйдзе час!..»

Словы Пугачова аказаліся прарочымі. Яны поўныя гістарычнай праваты. І гэтую праваты добра адчуваў юнак Ульянаў, які ўжо ў маладосці з вялікай павагай ставіўся да народа, любіў і верыў у яго.

З першых жа радкоў паэма А. Вялюгіна выклікае вялікую цікавасць, нягледзячы на тое, што мы шмат ведалі пра дзіцячыя гады Валодзі Ульянава і да гэтага. Паэт дэталёва вывучыў не толькі мясціны звязаныя з дзяцінствам і юнацтвам Валодзі Ульянава, сціплае жыццё і побыт сям'і Ільі Мікалаевіча, а і саму эпоху — Расію 70—80 гадоў мінулага стагоддзя. Чуткі пра тое, што адбывалася ў сталіцы — у далёкім Пецярбургу, — даходзілі сюды, у «пазаштатны» Сімбірск. Пакаранне Пяроўскай і Кібальчыча хвалявала і прымушала задумацца гімназістаў, моладзь Сімбірска. Паэма поўная свежых асацыяцый. У аўтарскіх унутраных маналогах перадаецца трывогі Валодзі Ульянава і яго равеснікаў, калі яны думаюць пра лёс народавольцаў, пра тых, хто гіне за народную справу.

Схаваўся снег у засень,
Дзе шумна ля акон
абняўся з вязам ясень,
з таполяй — гонкі клён.

Чакаючы цярпліва,
пасталі ля варот.
Няўжо з такіх. шумлівых,
збіваюць эшафот?

У кронах поўна ветру,
а ў шуме — дабраты.
Яны гамоняць ветла,
як сёстры і браты.

З самага пачатку паэмы чытач, асабліва малады, мае магчымасць пранікнуць, заглыбіцца ў душэўны свет Валодзі Ульянава, у тыя абставіны, сярод якіх гадаваўся хлопчык Ульянаў.

Адзін з самых хвалюючых вобразаў паэмы — вобраз вялікай рускай ракі Волгі, «Волгі Сцяпанаўны», як называе яе паэт:

Раздолле... Утопіцца вока там
у пеннай бяскрайняй красе,
дзе Волга Сцяпанаўна з рокатам
на Астрахань крыгі нясе.

Вобраз магутнай Волгі, якая ўвабрала ў сябе боль і слёзы ўсяго народа, вельмі характэрны для рускай класічнай паэзіі, для рускай народнай песні. А. Вялюгін дадае сюды сваю рысачку:

Маркотна ў рускай песні днела
над воляй Волгі і лугоў.
Мая, дняпроўская звінела
жалезнай скаргай ланцугоў.

Паэт засяроджвае ўвагу на тых разнастайных «складаемых», што «ўдзельнічалі» ў фармаванні характару юнака Ульянава. Велічнае відовішча магутнай Волгі, якая бачна была белагаловаму хлопчыку нават з вакна Сімбірскай класічнай гімназіі, душэўная шырыня рускай прыроды і рускага народа, сіла і магутнасць якога асабліва дакладна і поўна ўвасоблены ў фігуры каваля Парфірыя, і побач з гэтым мора зла і несправядлівасці, духоўны прыгнёт, «крычащие», як потым назаве іх Ленін, супярэчнасці тагачаснага грамадскага жыцця.

Са сталіцы прыязджае да Ільі Мікалаевіча — «дырэктара народных школ» — важны чыноўнік. Паміж імі адбываецца гаворка:

— Я, ваша міласць, вельмі
рады...
Цягну свой цяжкі воз. як вол,
І вось... знімаеце з пасады
дырэктара народных школ?..
Зяхнуў чыноўнік, франт
партрэтны
з маладзіком на галаве:
— А школы вашыя патрэбны
глухой аўчыне ды мардве?

Няхай свой бруд змываюць
потам,
з пяром загіне дрывасек...
Яшчэ з гадок працуйце...
потым —
са славай пенсія навек.

Ілья Мікалаевіч прытрымліваецца іншых поглядаў на народную асвету, на выхаванне дзяцей. Чыноўнік пытаецца ў яго:

— Скажыце як жа вашы дзеці...
Ці спраўна ходзяць у царкву?
— Калі папраўдзе — не заўсёды.
Зусім інакшы сёння свет.

— Эх вашыя і тут метады.
Патрэбна біць. хвастаць як
след!..

Паэт перадае рэакцыю Валодзі на гэтыя словы чыноўніка:

Валодзя выбег са сталовай,
ад ганка з ветрам — сугрунём.
«Патрэбна біць, хвастаць...» —
тры словы
Гнялі, палілі, як агнём.

І там,
дзе звоніць рэень нядзельны,
крынічкай точачы сумёт,
сарваў ён з шыі крыж нацельны
і кінуў. слёзны, у гарод.

У паэме добра адчута і перададзена атмасфера дэмакратычнасці і даверу ў сям'і Ульянавых, яе гарачае, актыўнае спачуванне да пакрыўджанага, бяспраўнага народа. У гэтай атмасферы рос і выхоўваўся Валодзя. Паэт імкнецца прасачыць і зразумець, як складваўся характар і душэўны свет Валодзі Ульянава, як фармаваўся яго светапогляд.

Абстаноўка ў гімназіі, узаемаадносіны з таварышамі, гульні і захапленні, настойлівая вучоба — з усяго гэтага вырастае цікавы і прывабны вобраз юнака Леніна:

Каля Валодзі той парою,
нібы на ветры пры кастры,
заўсёды грэліся гурмою
з усёй гімназіі сябры.

Апавядальнік, вучань першы,
ён верна, сціплы, мог дружыць:
пайсці зімой у рыбу з пешняй,
калі ад сцюжы свет дрыжыць;
на вераснёўскім зорным плёсе
сядзець і слухаць уначы,
як выпіўшы. шумяць аб лёсе
дзяржавы рускай асначы;

прыйшоўшы рана, па латыні
падрыхтаваць прыцiхлы клас,
калі ключамі залатымі
імкнуцца жоравы да нас;

панкоў і служак іх наёмных
у спрэчках жартамі разбіць;
дастаць у нейкіх там знаёмых
раман цікавы «Што рабіць?».

Між іншым, — і пра гэта я ўпершыню даведаўся з паэмы — сябрам маладосці Леніна быў будучы паэт Апалон Карынфскі, адзін з першых перакладчыкаў твораў Я. Купалы на рускую мову. Гэта змястоўная дэталь у паэме беларускага паэта.

Жыццёвыя выпрабаванні пачаліся для Валодзі Ульянава рана. Першым ударам для сям'і Ульянавых з'явілася смерць кармільца — Ільі Мікалаевіча. Нялёгкае жыццё пражыў гэты чалавек — «з роду майстравога», які вечна дбаў аб народзе, аб яго асвеце. Рэчаіснасць царскай Расіі не давала ды і не магла даць ажыццяўлення яго планам:

Царквой вайна абвешчана
Ягонай школе земскай:
навошта слова вешчае —
сцяліцеся паземкай,

шануйце, валахатыя,
сваіх паноў законы...
Над сэрцамі, над хатамі
сляпой начы запона.

— Народныя вучылішчы? —
і туз прысядзе з крэктам. —
Без іх дзяды жылі яшчэ.
Не трэба пан дырэктар...

Ураднік, прапаведнікі,
старшыны валасныя —
усе тваё асветнікі,
Расія... Эх. Расія.

Зрэшты, гэты і іншыя факты з біяграфіі маладога Леніна добра нам знаёмыя, але, паўтараю, паэтычна асэнсаваныя мастаком яны не могуць нас не захапіць, не ўсхваляваць.

Услед за смерцю бацькі прыходзіць з далёкага Пецярбурга другая жудасна трагічная вестка: пакараны смерцю старэйшы сын Ульянавых — Саша. Можна было падаць цару прашэнне аб памілаванні, але Саша знайшоў у сабе мужнасць адмовіцца:

«Пісаць?.. Я не магу. павер,
ва ўсім прызнаўся на судзе.
Было б няшчыра. каб цяпер
прасіў я літасці ў бядзе».

«Балада Трубяцкога бастыёна» — раздзел, прысвечаны Аляксандру Ульянаву — асабліва ўражвае.

Паэт расказвае пра ўсё гэта настолькі пранікнёна, мастацкі дакладна, што дасягаецца эфект прысутнасці аўтара сярод дзеючых асоб. Можна спрачацца (пра гэта гаварылася ў крытыцы), наколькі апраўдана ўвядзенне ў гэты раздзел маналога Юрыя Гагарына. Аднак паэт і сам папярэджвае ў прадмове: «пішучы, я глядзеў на даўнія падзеі вачыма свайго часу». Даўнія падзеі асвятляюцца сучаснасцю.

Галоўная ўдача паэмы — абаяльны, мастацкі паўнакроўны вобраз маладога Леніна. У яго характары ўжо ўгадваецца гатоўнасць да будучых рэвалюцыйных бітваў. І разам з тым, ён «такі як усе». Паэма добра перадае яго звычайнасць, блізкасць і зразумеласць нашаму маладому сучасніку.

Паэма «Вецер з Волгі» ўяўляецца мне пачаткам велічнай эпічнай задумы А. Вялюгіна, цэлага цыкла яго паэтычных твораў пра Леніна. Тып яснага, па-класічнаму звонкага верша, абраны паэтам, як нельга лепш перадае прыгажосць і высакароднасць аўтарскай задумы. У славесным арсенале беларускай мовы паэт знаходзіць сродкі, якія выразна і праўдзіва перадаюць паэзію вялікай біяграфіі будучага правадыра працоўных свету.

Закончыць хочацца словамі самога А. Вялюгіна:

Я лістаю паэму,
як вецер лістае дуброву:
ці кранула іржа
кроны думных дубоў,
зялёныя шаблі трысця?..
Гэта —
толькі прадмова.
Нанова
чытаю прадмову
да шляхоў,
навальніц,
глыбіні,
чысціні
найвялікшага ў свеце
жыцця.

ЮБІЛЕЙНЫЯ РАБОТЫ ЎМЕЛЬЦАЎ

У клубе Слонімскай кардоннай фабрыкі «Беларусь» адкрыта выстаўка самадзейных мастакоў і ўмельцаў прадпрыемства, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Увагу наведвальнікаў прыцягвае партрэт правадыра, выпалены па дрэве рабочым М. Сідаравым, а таксама яго работа «Ленін ля будана».

Работніца жыллёва-бытавога аддзела А. Крот дэманструе маляўнічыя дываны, а клубны мастак П. Данільчык — барэльеф Уладзіміра Ільіча.

Ленінскай тэме прысвечаны многія работы палескіх умельцаў, на юбілейнай выстаўцы ў Столінскім раённым Доме культуры. Многія з іх адлюстроўваюць тыя змены, што адбыліся на беларускім Палессі за гады Савецкай улады, а многія паказваюць вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна — стваральніка першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян.

Цікавыя работы заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі К. Казелкі — скульптура «Ленін гутарыць з сялянамі» і партрэты (разьба па дрэве) «Ленін у Горках» і «Ленін і селянін».

Баранавіцкі чыгуначнік, самадзейны мастак Юрый Паршын мае рэдкі самабытны талент. У яго руках і алоўак, і разец, і пэндзаль робяць цуды. Ю. Паршын па-майстэрску аформіў на станцыі Баранавічы-Цэнтральныя Ленінскі пакой са стэндамі аб жыцці і дзейнасці правадыра. А нядаўна мастак зрабіў арыгінальны мазаічны партрэт Уладзіміра Ільіча з 500 кавалачкаў рознакаляровага шкла.

Цяпер гэтая работа баранавіцкага самадзейнага мастака ўпрыгожвае залу чакання на пасажырскім вакзале.

ТЫСЯЧА ЭКСПАНАТАЎ

«Жывём і працуем па запаветах Ільіча» — гэтай тэме прысвечаны новы раздзел народнага музея віцебскіх чыгуначнікаў. Тут сабраны фатаграфіі, выразкі з газет і часопісаў, якія расказваюць аб барацьбе чыгуначнікаў за Савецкую ўладу ў гады рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, а таксама аб іх поспехах у дні ленінскай юбілейнай вахты.

Зараз у народным музеі каля тысячы розных экспанатаў, якія расказваюць аб векавой гісторыі Віцебскага вузла. Сярод іх нямала вельмі рэдкіх здымкаў.

■

Новая экспазіцыя абсталявана ў Барысаўскім краязнаўчым музеі. Яе матэрыялы прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Фотаздымкі, дыяграмы паказваюць росквіт прамысловасці, культуры працоўных горада на Бярэзіне.

Асабліва выдзяляюцца стэнды «Ленінскаму юбілею дастойную сустрэчу», «Жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць Ільіча».

За час падрыхтоўкі да ленінскага юбілею супрацоўнікі музея арганізавалі 50 тэматычных экскурсій, у якіх прыняло ўдзел больш як чатыры тысячы чалавек.

ЧАТЫРЫ П'ЕСЫ САМАДЗЕЙКАГА АЎТАРА

Зоя Ігнатаўна Зарыцкая — зубны ўрач. Але ў Глыбоцкім раёне яе ведаюць і як нязменнага кіраўніка драматычнага калектыву Падсвільскага Дома культуры. Яна ж і аўтар некалькіх п'ес, пастаўленых гэтым гуртком.

Гледачы ведаюць спектаклі па яе п'есах «Выпускнікі», «Цыганская праўда» і «Дала маці карыя вочы». Апошняя п'еса расказвае пра гаротнае жыццё беларускага сялянства ў буржуазнай Польшчы. Спектакль, што паставіла Зоя Ігнатаўна і ў якім выконвала галоўную ролю, быў адзначаны дыпломам на абласным фестывалі самадзейнага мастацтва.

Нядаўна З. Зарыцкая закончыла п'есу «Кроў за кроў». Гэта — расказ аб мужнай барацьбе беларускага народа з гітлераўскімі захопнікамі. Аўтар скарыстала ў творы багаты мясцовы матэрыял, які нагадае жыхарам Глыбоцкага раёна пра мужную барацьбу землякоў з фашысцкімі акупантамі.

В. КАРПОВІЧ.

НОВЫ МУЗЕЙ

Новы краязнаўчы музей адкрыўся ў Клічаве. У трох яго залах сабраны шматлікія рэліквіі народнай славы, якія расказваюць пра гераізм партызан і воінаў Савецкай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікую цікавасць уяўляюць дакументы падпольнага абкома партыі, які размяшчаўся ў вёсцы Усакіна і кіраваў партызанскай барацьбой на тэрыторыі Магілёўскай вобласці.

Экспазіцыя «Савецкі раён у тыле ворага» расказвае аб тым, як у сакавіку 1942 года ў Клічаве сіламі народных мсціўцаў была аднаўлена Савецкая ўлада і раён да самага вызвалення Беларусі заставаўся савецкім.

У музеі экспануецца партызанская зброя, прадметы быту і ваенны рыштунак партызанскіх атрадаў, асабістыя рэчы праслаўленых камандзіраў і падпольшчыкаў.

Адна з залаў музея прысвечана сённяшняму дню раёна. Яе дакументы расказваюць аб аднаўленні народнай гаспадаркі, росквіце культуры на Клічаўшчыне.

ВЯЛІКІ ПАЭТ І МЫСЛІЦЕЛЬ



Споўнілася 220 гадоў з дня нараджэння Егана Вольфганга Гётэ (1749—1832) — паэта, вучонага-прыродазнаўцы і філосафа, аднаго з самых значных прадстаўнікоў нямецкай літаратуры канца XVIII—пачатку XIX стагоддзяў, лепшыя творы якога ўвайшлі ў залаты фонд сусветнай літаратуры і сталі здабыткам прагрэсіўнага чалавецтва. Самае каштоўнае ў яго багатай літаратурнай спадчыне — трагедыя «Фаўст», твор, якому Гётэ аддаў 60 гадоў свайго жыцця і ў які ўклаў увесь свой вопыт, натхненне і любоў.

Любоў гэтая жыве і ў сэрцах сучасных чытачоў «Фаўста». Мы перажываем узлёты і падзенні героя, як свае, мы бачым у Фаўсце ўвасабленне чалавека-мысліцеля, чалавека — героя, барацьбіта і творцу новага жыцця, чалавека, які, вырваўшыся з вузкіх рамак свайго часу, кінуўшы дзёрзкі выклік чорным сілам свету, смела ідзе ў будучыню — шукае, сумняваецца, памыляецца і перамагае. Таму мы сёння і захапляемся «Фаўстам», аддаём даніну нашай шчырай павагі неўміручаму аўтару «Фаўста», любімага твора Карла Маркса, твора, які быў разам з Уладзімірам Ільічом Леніным у сібірскай ссылцы, твора, які стаў настольнай кнігай савецкіх чытачоў.

Каля дзесяці гадоў я працую над перакладам гэтага дарагога мне твора Гётэ на беларускую мову. І за гэты час зжыўся з яго героямі, палюбіў іх. Праца гэта бясконца радасная і прыемная — над кожнай страфой, над кожным радком... Прапаную чытачам «Літаратуры і мастацтва» невялічкі ўрывак з раздзела «Класічная ноч Вальпургіі» з другой часткі трагедыі.

Васіль СЁМУХА.

КЛАСІЧНАЯ НОЧ ВАЛЬПУРГІІ

ЛЯ ЎТОКАЎ ПЕНЕЯ

Пеней, акружаны ручаямі і німфамі.

ПЕНЕЙ

Пашапчыся, мой чарот,
Шалахціце вяззю голля,
Вербалозы і таполя,
Закруці вадаварот.
Недаспаў я. У грозным гудзе
І у ціхім шэпце рэха
Чую: будзе, нешта будзе —
Будзе нейкая пацеха.

ФАЎСТ (*выходзячы да ракі*)

Што такое! З-за лістоты,
З-за хлудоў праз чар дрымоты
Замагільны і суровы
Чую голас людскай мовы;
Вецер шастае ў начы;
Плешчуць хвалі аб карчы.

НІМФЫ (*Фаўсту*)

Найлепшы спачынак
Ад лесень сірэны —
Калі ў прахалодзе
Лагодзяцца члены.
Не маеш удосталь
Спакою спакон,
А мы табе песняй
Навеялі б сон.

ФАЎСТ

О, я не сплю! З якой прычыны
На яве трызніцца жанчыны,
Што водзяць вольны карагод!
Ці мара гэта, ці налёты
Пастылай колішняй самоты
З маіх пустых юначых год!
Плывуць у зарасці і шаты
Красуні гожыя, дзяўчаты,
Увасабленне чараўніц.
Нібы царыцы, нібы павы,
Свавольны, статны і рухавы
У празрыстай чыстасці крыніц
Ідуць у завадзь, дзе патокі
Басейн ствараюць ім шырокі —
Плывуць, любуюцца сабой.
І вось ужо там смех і віскі,
Звініць вада, іскрацца пырскі,
Ужо кіпіць гарэзны бой;
Лунаюць галасы далёка.
Палоціць гэтым відам вока!
О не! дапытлівы мой зрок
Вядзе туды, дзе прамяніцца
На троне гордая царыца
Праз навесь голля, мглу і змрок.

Цуд вялікі! Вольным плывам
Над успененым залівам,
Па зладжанай вадзе,
Шыі выгнуўшы дзяржаўна,
Самаўпэўнена і плаўна
Лебедзі у чарадзе.
Іх важак раскінуў крылы,
Хвалі гоніць з поўнай сілы —
І к царыцы. Чарада,
Як па знаку тайнай змовы,
Рассыпаецца на ловы —
Пенай пеніцца вада.
Ад раптоўнае развязкі
Дзевы службу абавязкі
Ураз забылі і з вады
З галасам, з адчайным шумам,
Голыя, бязладным тлумам
Уцякаюць хто куды.

НІМФЫ

Прытуліцеся к зямлі;
Сёстры, чуецца нібыта
Як даносіцца здалі
Тупат конскага капыта.
Ведаць бы, які лаўкач
У цямноцці мчыцца ўскач!

ФАЎСТ

Ад грымотніцкага чвалу
Гул і грукат па Фарсалу!

О лёсу йгра!
Хірон жа гэта.
Ідзе гара
Да Магамета!

Імчыць дрыгант, як на турніры;
Разумны, знаю, мудры ён,
Бо гэта ж слынны сын Філіры.
Спыніся ж! Дай савет, Хірон!

ХІРОН

Чаго табе!

ФАЎСТ

Аллюр стрымай!

ХІРОН

Няма калі!

ФАЎСТ

Чакай, чакай!
Вазьмі з сабой.

ХІРОН

Сядай!
Куды ідзеш! Перанясу імкліва
Цябе праз рэчку да заліва.

ФАЎСТ (*сядаючы*)

Мне ўсё адно. Удзячны я навек
Табе, вялікі чалавек,
Высакародны педагог,
Што ўзгадаваў для перамог
Героаў мужныя кагорты,
Апетых у паданнях гордых!

ХІРОН

Які настаўнік! Нават да Палады
Ужо ніхто не ходзіць па парады,
Цяпер і вучань стаў другі
І ўправіць ментару мазгі.

ФАЎСТ

Тады ўрачу, які адзін
Сакрэты ведае раслін
І немач лечыць, моц дае, —
Вітанні складваю свае!

ХІРОН

О, колісь быў я моцны духам,
Умеў залечваць раны сам,
Цяпер свой куншт аддаў шаптухам,
Знахаркам розным і папам.

ФАЎСТ

Як муж вялікі, муж бывалы,
Не любіш слухаць ты пахвалы,
І ўсім даруеш без аддачы
Свае заслугі, славу, ўдачы.

ХІРОН

А ты і нам і вам пахлебца —
Та: і без мыла ўвапрэцца.

ФАЎСТ

Згадзіся сам: героі, богі
Належаць да тваёй эпохі;
Ты з кемнем пробным, як паўбог,
Між імі жыў і ведаць мог,
Хто з персанажаў, ну, паложым,
Быў самым годным, самым гожым.

ХІРОН

Славутыя усе яны,
Эллады мужныя сыны:
У прыгажосці, ў цвёрдасці рукі
Выдатны Дыяскуры-юнакі,
Нязвыклай трапнасцю парады
Усіх захаплялі Барэяды,
Разважнасць, мудрасць і рэзон
Увасабляў пястун жанчын Ясон,
Арфей лагодны быў, сардэчны,
шчыры,
Чароўна граў усім на ліры,
Лінкей ніколі карабель
Не пасадзіў на рыф або на мель:
І ў перамозе і ў бядзе
Усе жылі ў дружнай грамадзе.

ФАЎСТ

А Геркулес, чым ён быў адмысловы!

ХІРОН

Не крой мне сэрца! Што тут словы!
На жаль не бачыў я Гермеса,
Не бачыў Феба і Арэса,
Затое ён, зямны, перада мной
Быў бог, і волат, і герой!
Юнак прыгожы, царскі сын,
Якому ўказам быў хіба
Старэйшы брат, капрыз жанчын,
Якім служыў ён за раба.
Такога больш не родзіць Гея,
І не ўзнясе на неба Гера,
Не ўславіць міф ці эпапея,
Не хопіць фарбаў у Гамера!

ФАЎСТ

Скульптура, песня, эпас, міф —
Усё ж не сведкі даўніх лет.
Мужчыну знаю з слоў тваіх,
А хто ж найпершая з кабет!

ХІРОН

Жыцця няма у іх красе:
Застылы і нямы партрэт
Пасля ўславіць рады ўсе.
Я ж толькі тую і цаню,
Што паліць полымем агню:
Гулліва, як марская пена; —
Царыца ўсіх красунь — Елена.
Я вёз яе.

ФАЎСТ

Ты вёз!

ХІРОН

Так, вёз!

ФАЎСТ

Хіроне!
О божа, як жа мне спрыяе лёс —
Сядзець на тым жа самым троне!

ХІРОН

Як ты цяпер, трымалася за грыву!

ФАЎСТ

Паспачувай майму парыву,
Бо чысты помыслы мае!
Хутчэй расказвай, не цягні, —
Куды і як ты вёз яе!

ХІРОН

Прыгода ладная У тыя дні
Сваю сястру з палону Дыяскуры
Удала вырвалі; ды не ў натуры
Разбойнікаў насіць прымір'я тогу
І аддаваць без бою перамогу:
Яны ў пагоню Не было б турботы,
Калі б не элеўсінскія балоты.
Браты уброд, а я наўпрост
З Еленаю праз багну ўшпарыў.
На зямлю скочыўшы, з пяшчотай
Мне грыву гладзіла удзячна, міла:
І я, стары, сабе прызнаўся ўпотай, —
Што і ва мне юнацтва абудзіла.

ФАЎСТ

І гэта ў дзесяць год!

ХІРОН

З' цябе пісакі
Паспелі вытоўціць рэзон усякі
Міфічныя жанчыны і паўбогі
Не йдуць у рамкі вашых філалогій, —
Тым больш Елена; ўплывы часу
Ёй не пашкодзілі ні разу.
Паэт ёй сам дае красу, узрост,
Прывабнасць і казанкаў доўгі хвост,
Віжоўкі вечныя, прыгоды,
Пазменна шлюбы і разводы, —
Усё. што так здзіўляе вас,
Яго не звязвае ніякі час.

ФАЎСТ

Хай старасць і яе міне!
Ну што ж, калі Ахіл у Ферах
Знайшоў Елену ў пазачасных сферах,
Чаму б не рызыкнуць і мне
Здабыць на зло закону ўдачы
Прадмет маёй любві гарачай.
Няўжо хаця б яе адну
Я да жыцця нахаднем не вярну!
Ты бачыў багабоўную даўно,
Я ж — сёння. І цяпер відно,
Што без Елены мне ўжо ніколі
Не мець ратунку, шчасця, долі.

З МІНУЛАГА

Лажэчнікаў у Віцебску

На маляўнічым беразе Заходняй Дзвіны ў Віцебску захаваўся прыгожы трохпавярховы будынак — былы губернатарскі палац. Тут у 1853—1854 гадах працаваў, займаючы пасаду віцэ-губернатара, вядомы рускі пісьменнік Іван Іванавіч Лажэчнікаў.

Семнаццацігадовым юнаком І. Лажэчнікаў упершыню апублікаваў у «Вестнике Европы» твор «Мае думкі». У 1812 годзе ён збег з дому і ўступіў у Маскоўскае апалчэнне. Удзельнічаў у бітвах пры Барадзіно, Малаяраслаўцы, Дрэздэне, Брыене, а таксама ва ўзяцці Парыжа. Неўзабаве ў «Вестнике Европы» з'явіліся яго «Паходныя запіскі рускага афіцэра».

Калі багатая купецкая сям'я, з якой паходзіў Лажэчнікаў, збяднела, ён паступіў на службу ў маскоўскі архіў замежнай калегіі. А ў 1853 годзе яго накіравалі ў Віцебск, куды ён прыехаў з добрым настроем, з творчымі задумамі. Тут, у цішы правінцыі, збіраўся многа пісаць. У творчых планах была і гісторыя Віцебска, мінулае якога Лажэчнікаў добра ведаў.

«Тут недалёка Астроўна, — піша ён сябрам, — дзе граф Остэрман-Талстой спыніў са жменькаю рускіх адборныя легіёны вялікай арміі вялікага Напалеона...»

Жыў І. Лажэчнікаў у двухпавярховым цагляным доме на былой Замкавай вуліцы. Цяпер на месцы гэтага дома (насупраць магазіна «Чайка») — сквер.

З першых дзён работы ў Віцебску пісьменнік сутыкнуўся з рознымі беззаконнямі. «Уявіце сабе, — піcаў ён з гневам знаёмым, — што ў адным стале за пяць гадоў не заслухана папер 1570, а ў другім — 1400. Па паўтара гады даюць даведкі ў грамадзянскую палату. Рашуча магу сказаць, што працую з раніцы да позняй ночы! І амаль кожны дзень перарабляю ўхіленні ад закона». У сваіх лістах пісьменнік з болем расказвае пра беднасць беларускай вёскі, пра жорсткую эксплуатацыю сялян.

Сам горад І. Лажэчнікава хутка расчараваў. «Крыты драўлянай чарапіцай. парослы мохам», ён нагнятаў на пісьменніка змрочныя думкі. На здзяйсненне творчых планаў не ставала часу. Тым не менш іменна Віцебск падказаў пісьменніку тэмы некаторых твораў. Жыццю ў Віцебску абавязаны Лажэчнікаў матывамі сваіх апавесцей «Унучка панцырнага баярына» і «Уся бяда ад сораму».

Пісьменнік рваўся ў Маскву да сяброў і знаёмых. «Город грустный, город сонный. скоро ль я с тобой прощусь и судьбою благосклонной вдаль на родину помчусь?» — піcаў ён.

Не дабіўшыся пераводу па службе ў іншае месца, І. Лажэчнікаў ў чэрвені 1854 года падае ў адстаўку і назаўсёды пакідае Віцебск.

А. ПАДЛІПСКІ.

Віцебск.

ДА 25-годдзя СЛАВАЦКАГА ПАЎСТАННЯ

НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕЦЦА

І НЕ ВЕРЫЦЦА, што ўжо дваццаць пяць гадоў сплыло з тых векапомных дзён. Нібы было гэта ўчора — жыве ў памяці жывізна сорак чацвёртага. Карпаты, ахутаныя парахавым дымам... Ідуць цяжкія баі, але на сэрцы нейк светла і радасна. Кожны разумее — скора перамога.

Там, у Карпатах, нашы салдаты біліся асабліва смела, напорыста — там, за Карпатамі, паўсталі нашы славацкія браты, якія змагаліся з фашыстамі і чакалі нашай дапамогі.

Перад намі была Карпацкая града з магутнымі пагранічнымі ўмацаваннямі, якія абараняла армейская група «Хейнрыцы» — гэта больш дваццаці дывізій, амаль 300 тысяч чалавек.

Днём і ноччу спецыяльная артылерыйская гвардзейская брыгада, якой я тады камандаваў, прабівалася праз горныя перавалы, прабівалася праз агонь і смерць. Мы знішчалі варожыя дзоты, камандныя пункты, спецыяльныя пасты.

Паступова наладзілі сувязь з мясцовымі жыхарамі — чэхамі і славакамі. Помню, такое. Нам выпала знішчыць нямецкі дзот, што стаяў на шляху нашай пяхоты. А дзот у гарах — гэта сапраўдная крэпасць. Разведчыкі ніяк не маглі знайсці падыходаў да яго. Вось тут і дапамог нам славак Матэ. Калі на зямлю спусцілася ноч, разведчыкі разам з Матэ рушылі ў паход. Потым ужо расказвалі, як ён у цемры, па нейкіх толькі яму вядомых ярыках, абмінаючы нямецкія пасты, правёў іх да дзота. Уладкаваўшыся на невялічкай вышыні, раніцай, яны навялі выдатную карэкціроўку. І пасля пятага залпу нашых дальнабойных гармат апорны пункт варожай абароны быў знішчаны.

Як на бяду немцы заўважылі нашых карэкціроўшчыкаў. Завязаўся няроўны бой, які працягваўся чатыры гадзіны. Адбіваючы шостую атаку, загінулі камандзір і трое байцоў. Тады аўтамат узяў з іх першым у рукі Матэ. На шчасце, ім удалося пратрымацца.

І зноў баі, баі. Амаль два з паловай месяцы савецкія воіны разам з сябрамі з першага чэхаславацкага корпуса, якім камандаваў Людвік Свобада, прабіваліся праз Усходнія Карпаты. У ходзе наступлення мы разграмілі нямецкую армейскую групу «Хейнрыцы». Было захоплена каля 32 тысяч палонных і многа баявой тэхнікі.

Прагладаючы свае архівы, я знайшоў фотаздымкі, на якіх нашы салдаты разбіраюць трафейныя гарматы. Мы не кінулі іх, яны зноў пайшлі ў бой.

У вызваленай Браціславе. Былы камандзір артылерыйскай брыгады Г. А. Адамчык (у цэнтры) сярод сваіх баявых сяброў.

Адначасова з франтавымі аперацыямі савецкае камандаванне пачало перакідаць паўстанцам аўтаматы, кулямёты, супрацьтанкавыя ружжы, гранаты, патроны, эвакуіраваць раненых.

Пачынаючы з 5 верасня ў Славакію, у тыл фашыстаў, рэгулярна перапраўляюцца дыверсійныя і партызанскія групы і атрады.

Камандзірамі многіх буйных партызанскіх злучэнняў у Славакіі былі савецкія людзі. Партызанскія атрады разам з паўстанцамі два месяцы ўтрымлівалі тэрыторыю ў 15 тысяч квадратных кіламетраў.

Славацкае паўстанне назаўсёды ўвайшло ў гісторыю, як знамянальны этап антыфашысцкай барацьбы чэхаславацкага народа. Па свым размаху яно стаіць у радзе самых масавых выступленняў супраць фашызму ў Цэнтральнай Еўропе.

Памяць аб векапомных днях і цяпер, праз чвэрць веку, дарагая кожнаму савецкаму чалавеку, кожнаму чэху і славаку, дарагая, як прыклад сумеснай барацьбы супраць злейшага ворага нашых народаў — нямецкага фашызму, як прыклад перамогі пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Г. АДАМЧЫК,
былы камандзір спецыяльнай гвардзейскай артылерыйскай брыгады, ганаровы грамадзянін горада Браціславы.

Фільмы пра Рэмбранта

«Вольны як птушка!» — так названы новы дакументальны фільм аб жыцці і творчасці Рэмбранта, здымкі якога пачаліся ў Галандыі. Ён павінен выйсці на экраны ў пачатку кастрычніка, калі споўніцца 300 гадоў з дня смерці геніяльнага галандскага жывапісца.

Хаця сцэнарый карціны быў закончаны яшчэ некалькі месяцаў назад, здымкі доўга адкладваліся з-за таго, што аўтары фільма не маглі падабраць натуру. Рэмбрант нарадзіўся ў Лейдэне—горадзе, які славіўся сваімі маляўнічымі дамамі-замкамі, старымі млынамі. Многія замкі і млыны захаваліся да нашых дзён, аднак, як высветлілася, пры падрыхтоўцы да здымак у горадзе практычна немагчыма знайсці такі куток, дзе б у кадр не трапляў бы тым або іншым «атрыбуты XX веку»: тэлеграфныя слупы, тэлевізійныя антэны, сучасныя дарогі і да т. п. У пошуках натуры аўтары фільма пабывалі ў розных раёнах Галандыі. Патрэбны для здымак куток знайшоўся ў правінцыі Зееланд, дзе знаходзіцца адзін з самых прыгожых у Галандыі старадаўніх млыноў.

Кінарасказ пра Рэмбранта рыхтуе моладзь. І рэжысёр Б. Дамен, і аператар П. Брукман — выпускнікі Амстэрдамскай кінаакадэміі, скончылі яе толькі сёлета. Фільм «Вольны як птушка!»—іх першая самастойная работа.

Ю. КАРНІЛАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Вераснёўскі экран

«ЖЫВЫ ТРУП»

Карціна пастаўлена на кінастудыі «Ленфільм» па аднайменнай п'есе Л. Талстога.

— Я стараўся пазбегнуць кардынальных пераробак твора, — гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык Уладзімір Венгераў. — Частку сцэн, якія здаліся мне найбольш закончанымі і сучаснымі (з пункту гледжання прыгоднасці да экранізацыі) я браў у Талстога цалкам, некаторыя скарачаў, каб пазбегнуць паўтораў, якія маглі ўнесці «сцэнічнасць», частку давялося апусціць зусім. Так дыктуюць суровыя законы кінематографа.

У ролі Фёдара Пратасава здымаецца заслужаны артыст РСФСР Аляксей Баталаў. Яго жонку Лізу іграе актрыса Маскоўскага тэатра на Таганцы Ала Дзямідава.

У ролі цыганкі Машы выступае маладая актрыса Святлана Тома. Упершыню гледачы ўбачаць яе ў малдаўскім фільме «Чырвоныя паляны».

У фільме заняты таксама Алег Басілашвілі (Віктар Карэнін), Лідзія Штыкан (Ганна Паўлаўна), Алена Чорная (Саша), Соф'я Піляўская (Ганна Дзмітрыеўна), Яўгеній Кузняцоў (князь Абрэзкаў), Інакенцій Смактуноўскі (Іван Пятровіч) і інш.

Фёдар Пратасаў — артыст Аляксей Баталаў.

«ГАЛОЎНЫ СВЕДКА»

Маша—Алена Санаева, Мацвей Савіч—Аляксандр Бяляўскі.

Так называецца новая шырокаэкранная мастацкая кінастужка, пастаўленая рэжысёрам Аідай Манасаравай на кінастудыі «Масфільм» па матывах апавядання А. Чэхава «Бабы».

Апавяданне прыцягнула ўвагу кінематаграфістаў сучасным гучаннем, думкай пра адказнасць кожнага чалавека за свае ўчынкі.

У фільме гучыць тэма пратэсту вялікага пісьменніка супраць бяспраўя рускай жанчыны, за сцвярджэнне яе годнасці. Гераіня карціны Маша актыўна змагаецца за свае права на каханне, за свабоду асобы, паступова вызваляючыся ад рабскай залежнасці.

У галоўных ролях здымаліся Аляксандр Бяляўскі (Мацвей Савіч), Алена Санаева (Маша), Ларыса Даніліна (Соф'я), Ларыса Лужына (Варвара), Міхаіл Кіслоў (Вася.) Усевалад Санаеў (Піліп Кашын) і інш.

«ІНЕЙ ПАДАЕ»

У ролі Сільваны — Нэлі Мышкова.

Вытворчасць Кіеўскай кінастудыі імя А. Даўжэнкі. Аўтар сцэнарыя Канстанцін Кудзіеўскі, рэжысёр-пастаноўшчык Віктар Іўчанка.

Гэта фільм аб лёсе чалавека, які ў гады вайны дзіцём быў вывезены на Захад, прайшоў доўгі шлях бадзянняў і нягод, перш чым вярнуўся на радзіму.

У ролі галоўнага героя карціны Ганса здымаўся артыст Кіеўскага тэатра імя Івана Франка Сцяпан Алексенка. Гледачам ён знаёмы па ролях Лаэрта ў «Гамлеце» і Перамытава ў «Дзесятым кроку». Папулярная актрыса Нэлі Мышкова знялася ў ролі Сільваны.

«ДВАРАНСКАЕ ГНЯЗДО»

Гедзеаноўскі—Васіль Мяркур'еў, Лаўрэцкі—Леанід Кулагін.

Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». Аўтары сцэнарыя — Валянцін Яжоў і Андрэй Міхалкоў-Канчалоўскі, рэжысёр-пастаноўшчык — Андрэй Міхалкоў-Канчалоўскі. Фільм — экранізацыя аднайменнага рамана І. Тургенева.

— Галоўным героем карціны,— расказвае рэжысёр-пастаноўшчык фільма,—я лічу Лаўрэцкага. Усё прапушчана праз яго свядомасць, яго ўспрыняцце. У цэлым фільм— гэта позірк на свет, на эпоху, на радзіму вачыма інтэлігентнага, разумнага і ў той жа час крыху пасіўнага, бязвольнага чалавека, які вярнуўся пасля доўгіх вандраванняў па Еўропе ў Расію, адвыклы ад яе і спустошаны. Галоўная тэма карціны — пазнанне радзімы і пошукі свайго месца на роднай зямлі чалавекам, які зрабіў выбар.

Ролі ў фільме выконваюць: Ліза—Ірына Купчанка, Лаўрэцкі — Леанід Кулагін, Варвара Паўлаўна—Беата Тышкевіч, Марыя Дзмітрыеўна — Тамара Чарнова, Гедзеаноўскі — Васіль Мяркур'еў, Паншын — Віктар Сергачоў, Лем— Аляксандр Кастамалоцкі.

■

Для дзяцей у верасні будзе дэманстравацца новая мастацкая кінастужка «Мой тата—капітан», пастаўленая рэжысёрам Уладзімірам Бычковым на Маскоўскай кінастудыі імя Горкага па сцэнарыі А. Зака і І. Кузняцова.

З зарубежных кінафільмаў гледачы змогуць убачыць: «Тайна драўляных ідалаў» (ГДР), «Фальшывая Ізабела» (Венгрыя), «Небяспечны палёт» (Балгарыя), «Сава з'яўляецца ўдзень» (Італ'я), «Сястра Керы» (ЗША).

Многа цікавага раскажуць новыя хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінакарціны «Сцяг над светам» (Ленін і III Інтэрнацыянал), «Ілья Мікалаевіч», «Таварыш Берлін», «Сустрэча на арбіце», «Скрыжаванне адкрыццяў», «Да праўды шлях далёкі», «Жар халодных лічбаў», «Маштабы», «Сонца над Самалі», «Канструктар і кібернетыка», «Гарызонты дружбы», «Ці чужыя дзеці?» і інш.

Пытанням літаратуры і мастацтва прысвечаны новыя кінастужкі «Усевалад Іванаў», «Жыццё Навai», «Назіб Жыганаў», «Інтэрв'ю Веранікі Дударавай», «Археалогія», «Пра архітэктуру, час і самую доўгую вуліцу».

Беларускія кінадакументалісты перадаюць над суд гледачоў новыя кінафільмы «Браты Бонч-Бруевічы», «Паездка ў Кіршы» (пра жыццё і працу членаў сельгасарцелі імя Жданава Мінскага раёна) «Пачнём з хады» (аб праблеме адпачынку).

НОВЫЯ ПРАГРАМЫ ЗАКАРПАЦКАГА ХОРУ

Сярод лепшых мастацкіх калектываў Украіны—Дзяржаўны Закарпацкі народны хор. Ансамблю амаль чвэрць стагоддзя. За гэты час ансамбль пад кіраўніцтвам народнага артыста УССР Міхаіла Крачко стварыў каля трох дзясяткаў канцэртных праграм — 750 нумароў. Сахалін, Прыбалтыка і Закаўказзе, Венгрыя, Польшча і Чэхаславакія — такая «геаграфія» гастрольных падарожжаў хору, які даў больш чатырох тысяч канцэртаў.

У рэпертуары ансамбля, які налічвае сто чалавек (хор, аркестр народных інструментаў і танцавальная група), больш 150 песень і танцаў розных раёнаў Закарпацця, братніх саюзных рэспублік і сацыялістычных краін.

Зараз калектыў ансамбля рыхтуе тры новыя праграмы, адна з якіх, «Ленін у Карпатах», прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння вялікага правадыра працоўных.

Вось што расказаў Міхаіл Крачко аб новай рабоце калектыву:

— У першую чаргу мы звярнуліся да бяздоннай крыніцы мудрасці і прыгажосці — фальклору. Выдатныя ўзоры фальклорнай «Ленініяны» мае ўкраінскі народ. Сярод іх — калямыйкі, казкі, легенды, сказы. Мы сабралі лепшыя з народных калямыек (прыпевак) пра Леніна і разам з кампазітарам Сцяпанам Мартавым стварылі праграму, якую назвалі словамі адной калямыйкі: «Ленін любімы, Ленін родны, а мы яго дзеці».

Ленінскую тэму ў вуснай народнай творчасці ў нашай новай рабоце прадстаўляе «Казка пра Івана», запісаная ад Івана Ільюці ў сяле Дарабратава. Вядома, што сярод нашых горцаў бытуюць легенды-казкі аб знаходжанні Леніна на паланінах, аб яго размовах з аўчарамі, сустрэчах і гутарках з лесарубамі. Вось гэта і склала аснову «Казкі пра Івана».

У партфелі калектыву ёсць, апрача таго, дзве цікавыя па сваёй інтанацыйна-рытмічнай будове «Песні аб Леніне» Задора Дэйдзера. Асобным раздзелам у гэтым тэматычным канцэрце прагучаць аб'яднаныя пад назвай «Вянок дружбы» рускія, польскія, венгерскія, славацкія і румынскія народныя песні.

Другая наша праграма будзе насіць іншы характар. Гэта камерны канцэрт пад назвай «Вечар украінскай песні» ад класічных мініяцюр да разгорнутых эпіка-драматычных песенных палотнаў. У першым аддзяленні прагучаць класічныя апрацоўкі песень Мікалая Леантовіча і малавядомыя апрацоўкі ўкраінскіх песень Кошыца. Другое аддзяленне мы адвялі для песень двух савецкіх кампазітараў — Яўгена Казака і Рыгора Вяроўкі. У гэтай праграме хор прадэманструе традыцыйнае ўкраінскае акапэльнае спяванне, пакажа сваё выканаўчае майстэрства на складаных песенных узорах, якія патрабуюць выдатнага валодання ўсімі элементамі харавога спявання.

Трэцяя праграма — «З народнай крыніцы». У ёй мы пакажам народную песню ва ўсіх варыянтах яе бытавання ў народзе. Гэта лірычныя песні аб каханні, бытавыя, жартоўныя песні, балады, дасціпныя народныя танцы. Потым будзе паказана танцавальна-харавая кампазіцыя «Закарпацкае народнае вяселле» з усімі цудоўнымі народнымі абрадамі, звычаямі, якія вякамі стварылі людзі нашага краю.

Уладзімір ПАПОЎ,
карэспандэнт АДН.

КОНКУРС: ЖЫТЛО ДЛЯ ВЁСКІ

У ВЁСКАХ Савецкай Беларусі ўсё большы размах набывае жыллёвае будаўніцтва — дзяржаўнае, калгаснае, кааператыўнае, індывідуальнае. Каб праекты жылых дамоў распрацоўвала яшчэ больш спецыялістаў, каб шырэй ужываліся перадавы айчынны і зарубежны вопыт, сучасныя архітэктурныя формы і эканамічныя рашэнні, Дзяржбуд БССР і Саюз архітэктараў рэспублікі аб'явілі адкрыты конкурс на лепшы праект жытла для вёскі. Яго вынікі ў многім вызначаць кірунак жыллёвага будаўніцтва ў сельскай мясцовасці на бліжэйшыя пяць гадоў.

Праектныя прапановы на конкурс павінны адпавядаць сучасным патрабаванням арганізацыі жыцця, быту і працы працаўнікоў вёскі, прадугледжваць выкарыстанне будаўнічых дэталяў і канструкцый заводскай вытворчасці, мясцовых матэрыялаў, улічваць архітэктурна-мастацкія і нацыянальна-бытавыя традыцыі Беларусі.

Конкурс праводзіцца па трох тэмах: двухпавярховыя секцыйныя жылыя дамы, двухпавярховыя блакіраваныя жылыя дамы з кватэрамі ў двух узроўнях і сядзібныя адно- і дзвюхкватэрныя жылыя дамы для індывідуальнага будаўніцтва.

Жылыя дамы павінны забяспечыць пакватэрнае рассяленне розных сем'яў з нормай жылой плошчы не меней дзевяці квадратных метраў на чалавека.

Кватэры ва ўсіх тыпах дамоў складаюцца з жылых пакояў (агульныя, спальныя) і падсобных памяшканняў (кухні, пярэднія, калідоры, ванныя, туалеты, кладоўкі, шафы, летнія памяшканні). Для прадуктовых запасаў (бульба, гародніна, фрукты і інш.) у дамах павінны быць падвалы. Пры адно-дзвюхкватэрных жылых дамах, дзе гэта магчыма, пажадана мець таксама халодныя кладоўкі.

Секцыйныя жылыя дамы павінны быць кватэрамі ў адзін, два, тры, чатыры пакоі для сем'яў, ад двух да шасці чалавек. Агульная колькасць кватэр у секцыі і доме вызначаецца і абгрунтоўваецца аўтарамі праектных прапаноў. У секцыйных дамах рэкамендуюцца наступныя суадносіны розных тыпаў кватэр: аднапакаёвых — 10—20 працэнтаў, двухпакаёвых — 30—40 працэнтаў, трохпакаёвых — 30—40 працэнтаў і чатырохпакаёвых — 20—30 працэнтаў. Працэнтныя суадносіны могуць быць зменены пры адпаведным абгрунтаванні.

Блакіраваныя дамы з кватэрамі ў двух узроўнях разлічаны на вялікія сем'і, якія маюць індывідуальную падсобную гаспадарку. Улічваючы гэта, на тэрыторыі пад забудову неабходна прадугледзець зямельныя ўчасткі плошчай да 800 квадратных метраў і гаспадарчыя будынкі (хлеў для паліва і інвентара, для хатняй птушкі і інш.), якія прымыкаюць непасрэдна да жытла. Пажадана ў гэтых дамах запраектаваць на першым паверсе два жылыя пакоі, акрамя кухні.

Адна- двухкватэрныя сядзібныя дамы прызначаюцца для індывідуальнага будаўніцтва і размяшчаюцца на ўчастках у 0,06—0,12 гектара, на якіх павінны быць таксама гаспадарчыя пабудовы (хлеў для паліва і інвентара, для дробнай і буйной жывёлы, птушкі, склеп і інш.).

Аднакватэрныя сядзібныя дамы разлічваюцца на два, тры, чатыры і пяць пакояў. Дамы могуць праектавацца аднапавярховымі, мансарднымі або двухпавярховымі.

Рэкамендуецца наступная карысная плошча кватэр: аднапакаёвых — ад 26 до 40, двухпакаёвых — ад 44 да 53, трохпакаёвых — ад 57 да 66, чатырохпакаёвых — ад 69 да 79 і пяціпакаёвых — ад 82 да 94 квадратных метраў.

Вышыня жылых памяшканняў ва ўсіх тыпах дамоў — ад падлогі да столі — 2,8 метра.

Вялікую ўвагу ў праектах трэба звярнуць на эканамічнасць архітэктурна-планіровачных рашэнняў, сучаснасць архітэктурна-мастацкай трактоўкі, выкарыстанне лепшых традыцый народнай архітэктуры.

Ва ўсіх тыпах жылых дамоў прадугледжана поўнае інжынернае забеспячэнне: водаправод, каналізацыя, цэнтральнае або пакватэрнае ацяпленне, электрычнасць, газ, слабаточнае абсталяванне. Сядзібныя адна-двухкватэрныя дамы павінны мець варыянт з пячным ацяпленнем. Печ на кухні ва ўсіх выпадках павінна быць разлічана на цвёрдае паліва.

Улічваючы, што будаўніцтва будзе весціся падрадным або гаспадарчым спосабам, праектныя прапановы секцыйных і блакіраваных дамоў распрацоўваюцца:

а) поўназборныя (панелі, буйныя блокі, аб'ёмна-прасторныя блок-пакоі) з жалезабетоннымі індустрыяльнымі перакрыццямі і іншымі канструктыўнымі элементамі, якія дазваляюць наладзіць іх заводскі выраб;

б) са сценамі з мясцовых матэрыялаў (цэгла, дробныя блокі і інш.). У спалучэнні з жалезабетоннымі перакрыццямі. У адпавярховых дамах могуць быць ужыты драўляныя перакрыцці.

Праектныя прапановы адна-двухкватэрных сядзібных жылых дамоў павінны мець варыянт сцен з мясцовых будаўнічых матэрыялаў у спалучэнні з камплектамі завадскіх драўляных дэталяў і варыянт сцен з дрэва.

Ва ўсіх тыпах жылых дамоў неабходна дабівацца скарачэння колькасці разнатыпных канструкцыйных элементаў (пліт, бэлек, рыгелей і да т. п.).

Планіровачныя параметры аўтары выбіраюць самастойна.

За лепшыя праектныя прапановы па кожнай тэме жылых дамоў устаноўлены наступныя прэміі:

Па серыі двухпавярховых секцыйных жылых дамоў адна першая прэмія — 700 рублёў, дзве другія — па 500, дзве трэція—па 250, дзве заахвочвальныя—па 150 рублёў.

Па серыі блакіраваных жылых дамоў з кватэрамі ў двух узроўнях адна першая прэмія — 800 рублёў, дзве другія — па 600, дзве трэція—па 250, дзве заахвочвальныя — па 150 рублёў.

Па серыі адна-двухкватэрных сядзібных жылых дамоў адна першая прэмія — 700 рублёў, дзве другія прэміі—па 500, дзве трэція прэміі — па 250, дзве заахвочвальныя прэміі — па 150 рублёў.

Праектныя прапановы, якія не атрымаюць прэмій, але будуць у пэўнай меры цікавыя для забудоўшчыкаў, могуць набывацца па цане, роўнай заахвочвальнай прэміі.

Усе праектныя матэрыялы прадстаўляюцца пад дэвізам у Саюз архітэктараў БССР (Мінск, вуліца Карла Маркса, 14) да 1 снежня 1969 года. З 2 па 10 снежня наладжваецца выстаўка праектных прапаноў, з 15 снежня — выстаўка прэміраваных праектаў.

Для правядзення конкурсу створана журы на чале са старшынёю Дзяржбуда БССР У. Каралём.

Па той бок

ЛІТАРАТУРНАЯ ПРЭМІЯ... БЫЛОМУ НАЦЫСТУ

З вялікім абурэннем прыняла бельгійская прагрэсіўная грамадскасць паведамленне аб прысуджэнні літаратурнай прэміі фламандскіх правінцый быламу нацысту, ваеннаму злачынцу Х. Эліясу. Рашэнне аб прысуджэнні прэміі, прынятае выканаўчымі органамі чатырох фламандскіх правінцый (правінцыя Брабант выступіла супраць), яшчэ раз пацвердзіла жаданне пэўных колаў Бельгіі абяліць былых нацыстаў, удзельнікаў розных фламандскіх нацысцкіх арганізацый у перыяд другой сусветнай вайны.

«Лаўрэат» гэтай літаратурнай прэміі Эліяс, як пішуць газеты, быў у час вайны ў Бельгіі тым, кім Квіслінг ў Нарвегіі, Лаваль у Францыі. Ён быў адным з лідэраў арганізацыі «Фламс нацыяналь вербонд», якая ў 1932—1940 гг. складалася з платных гітлераўскіх агентаў якія рыхтавалі ў Бельгіі «пятую калону» к пачатку фашысцкага нападу. Эліяс узначальваў рад злачынных тэрарыстычных арганізацый тыпу «Чорная брыгада», «Фламандская СС», якія тэрарызавалі бельгійскіх патрыётаў, рабілі даносы і шпіёнілі сярод мясцовага насельніцтва для гестапа. Актыўную дзейнасць разгарнулі члены гэтых арганізацый і на ўсходнім фронце ў барацьбе супраць савецкіх патрыётаў, супраць народаў Чэхаславакіі, Аўстрыі.

У газетах апублікаваны фатаграфіі часоў гітлераўскай акупацыі, на якіх дагледжаны чалавек у чорнай эсэсаўскай форме паказаны то на трыбуне са свастыкай, то на ваенных вучэннях. «Фюрэрам фламандцаў» называла Эліяса ў хвалебным артыкуле нацысцкая газета «Дас райх».

Пасля вызвалення Бельгіі Эліяс уцёк, але быў схоплены і прыгавораны да смерці за шматлікія злачынствы. Гэты прыгавор быў потым заменены турэмным зняволеннем, і, ён быў памілаваны і вызвалены.

Гэтаму мацёраму злачынцу і была прысуджана літаратурная прэмія фламандскіх правінцый!

Намеснік старшыні сацыялістычнай партыі Ван Эйндэ асудзіў прысуджэнне літаратурнай прэміі са сродкаў унесеных фламандскімі падаткаплацельшчыкамі. «Як можна дапусціць, — піша Ван Эйндэ, — каб гэты нацыст карыстаўся грамадскімі сродкамі і пашанай дзяржавы, якую ён хацеў разбурыць, пашанай людзей і інстытутаў, з якімі ён змагаўся, калі служыў нямецкаму нацызму».

Прысуджэнне прэміі Эліясу адбываецца ў перыяд, калі ўзмацняецца дзейнасць розных неанацысцкіх груп і арганізацый у Фландрыі і ва ўсходніх раёнах Бельгіі. У апошні час пачасціліся выпадкі бясчынстваў фашысцкіх малойчыкаў з фламандскіх нацыяналістычных арганізацый, распаўсюджанне іх прапагандысцкіх лістовак і брашур, правядзенне розных «цырымоній» у памяць былых бельгійскіх эсэсаўцаў і «барацьбітоў на ўсходнім фронце». Усё гэта выклікае абурэнне і трывогу ў прагрэсіўных і патрыятычных арганізацый краіны.

В. ВОЛКАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ТУПІКУ

У галіне культуры наша грамадства цяпер напярэдадні крызісу— такую ацэнку стану сучаснай нарвежскай культуры даў прафесар А. Свендсен. Ён выступіў з дакладам на ўсенарвежскай канферэнцыі па праблемах культуры, арганізаванай у сувязі з фестывалем мастацтваў у горадзе Бергене.

І, сапраўды, палітыка цяперашняга буржуазнага ўрада ў галіне культуры зайшла ў тупік. Рэдактар Бергенскага універсітэта прафесар Х. Мусбю які таксама выступіў на канферэнцыі, рэзка крытыкаваў становішча ў галіне культуры ў новых індустрыяльных цэнтрах і ўскраінных раёнах краіны. Ён адзначыў, у прыватнасці, адсутнасць агульнадзяржаўнага плана будаўніцтва культурных аб'ектаў. Паводле дадзеных Мусбю, на дзяржаўныя патрэбы ў галіне культурных мерапрыемстваў летась было выдзелена з бюджэту 2,4 мільярда крон, прычым толькі 93 мільёны крон з гэтай сумы, гэта значыць менш як 3 працэнты, было выкарыстана па прамым прызначэнні. Астатнія грошы былі патрачаны на пакрыццё выдаткаў, якія маюць толькі ўскоснае дачыненне да культуры. І гэта ў час, калі, напрыклад, Нацыянальны тэатр оперы і балета закончыў 1968 год з найвялікшым дэфіцытам за сваю гісторыю — 2,4 мільёна крон

Крызіс ахоплівае ўсё новыя галіны культурнага жыцця Нарвегіі. З крытычнымі заявамі выступаюць мастакі і артысты, кампазітары і пісьменнікі, работнікі кіно і бібліятэк. На нацыянальнай канферэнцыі бібліятэчных работнікаў, якая адбылася ў маі, пісьменнік С. Ронінг, напрыклад, прывёў пераканаўчыя факты, якія сведчаць аб цяжкім стане, у якім у апошнія гады аказаліся нарвежскія бібліятэкі (дарэчы, сама тэма гэтай канферэнцыі мела красамоўную назву—«Нашы бедныя бібліятэкі»). Кнігі ў Нарвегіі вельмі дарагія, таму многія нарвежцы звычайна чытаюць новыя кнігі ў бібліятэках. Але тут і пачынаюцца «блуканні па пакутах». 25 працэнтаў усіх нашых бібліятэк, адзначыў Ронінг, да гэтага часу не маюць сваіх памяшканняў і туляцца ў розных установах. А кнігі часам захоўваюцца... нават на стэлажах у партовых складах, у цэрквах. 90 працэнтаў усіх камунальных бібліятэк Нарвегіі не маюць штатнай пасады бібліятэкара, які працаваў бы на поўную стаўку.

На канферэнцыі было адзначана, што дрэнна пастаўлена і ўкамплектаванне бібліятэк новымі кнігамі. «У нас бедныя бібліятэкі, — сказаў Ронінг,—але затое ў нас ёсць багаты культурны савет, які за тры апошнія гады ўсадзіў больш мільёна крон на закупку нізкапробнай літаратуры». Удзельнікі гэтай канферэнцыі выступілі за тое, каб былі неадкладна прыняты якія-небудзь меры па паляпшэнні бібліятэчнай справы ў Нарвегіі.

Вельмі няёмка адчуваў сябе нядаўна дэпутат сторцінга Улаф Кортнер, калі яго папрасілі выступіць перад студэнтамі Бергенскага універсітэта. На гэтым студэнцкім сходзе гаворка ішла аб абыякавасці ўлад да культурных запатрабаванняў насельніцтва. Кортнер вымушаны быў прызнаць, што ў так званай доўгатэрміновай праграме ўрада культура забыта.

Такая пагарда улад да пытанняў развіцця культуры выклікае энергічныя пратэсты ў прагрэсіўнай нарвежскай грамадскасці.

П. КУШ.
(ТАСС).

Тэлебачанне

29 жніўня

Першая праграма. 10.00 — навіны (М). 10.15—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Бывай, дзіцячы сад!» Перадача з Куйбышава. 10.45—канцэрт лаўрэатаў Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва (М). 11.45—для школьнікаў. «Тэлезнайка» (М). 12.15—«Здароўе» (М). 16.45 — праграма перадач 16.50—навіны (М). 17.00—«Слава героям працы». Перадача з Ленінграда. 18.00—«Панарама навін». 18.20 — дзіцячы экран. «Хачу басціся». Мультыплікацыйны фільм. 18.30—праграма каляровага тэлебачання. Рэпартаж з Маскоўскага заапарка (М). 19.30—міжнародны турнір па валейболу. СССР—Японія. Мужчыны (М). 21.00—«Эстафета навін» (М). 21.45—праграма каляровага тэлебачання. «Папаўся». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля па апавяданнях А. П. Чэхава. (М). 22.45 — «Сельскі веснік» 23.15—«А ў нас у верасні». Музычная праграма (М). 00.00—навіны (М).

Другая праграма. 18.00 — для дзяцей. «Ціп-Цяп». Лялечны спектакль. Перадача з Таліна. 18.30 — дзіцячы экран. «Каваль-чарадзей». Мультфільм. 21.00 — «Васіль Сурыкаў». Мастацкі фільм. 22.30 — рэклама, аб'явы. 22.45 — «Фізкультура і спорт». Перадача з Тбілісі.

30 жніўня

Першая праграма. 8.55 — праграма перадач. 9.00 — «Гімнастыка для ўсіх». (М). 9.45 — навіны (М). 10.00 — «Будзьце шчаслівыя» (М). 10.30 — для дзяцей. «Атрад Трубачова змагаецца». Мастацкі фільм. 12.00—«Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 12.20 — «Коцік-Моцік». Спектакль Дзяржаўнага тэатра лялек Латвійскай ССР. 13.30 — «Тэлевізійны атлас народаў СССР». Марыйская АССР (М). 14.00 — «Дзённік пяцігодкі». Да Дня шахцёра. 14.30 — «І ніхто іншы». Мастацкі фільм. 16.00—«Час Радзімы». «Мастацтва — народу». Агульнасаюзны рэпартаж (М). 17.00 — «Народны кантроль». Тэлевізійны часопіс. 17.45 — «Наша пошта». Тэхнічная кансультацыя. 18.05 — «Міжнародны квартэт». Перадача з Берліна. 19.00 — праграма каляровага тэлебачання. «Гусарская балада». Мастацкі фільм (М). 20.30 — «Свет сацыялізма» (М). 21.15 — праграма каляровага тэлебачання. «Не жыць мне без цябе, Юстэ!». Тэлевізійны спектакль (М). 22.00—канцэрт Славацкага нацыянальнага ансамбля. Перадача з Браціславы. 22.45 — навіны (М). 23.00 — «Вечар аперэты». Перадача з Сафіі. 23.45 — навіны (М).

Другая праграма. 10.30 — «Вынаходнік». Тэлеклуб (М). 11.00 — «Сустрэчы з майстрамі тэатра». Народны артыст СССР А. Васадзе. Перадача з Тбілісі. 12.00 — «Здароўе» (М). 12.30 — тэатр юнага гледача. «Па шчупаковым загадзе». Спектакль Горкаўскага тэатра лялек. Перадача з г. Горкага. 13.30 — у свеце мастацтва і літаратуры. «Сустрэча ў Ялце», «Маналог». Кінанарысы. 14.00 — «Веды». Перадача з Сочы. 14.30 — у эфіры—«Маладосць» (М). 15.30 — навіны (М). 17.00 — «Песня руская». Канцэрт хору рускай песні Усесаюзнага радыё і тэлебачання (М). 18.05 — дзіцячы экран. «Асцярожна, шчупак!». «Першая экспедыцыя». Мультфільмы. 18.30 — «Джэні Герхарт». Спектакль Чарнігаўскага музычна-драматычнага тэатра імя Т. Р. Шаўчэнкі. 21.30 — «Упершыню на тэлеэкране». Іграе Аляксандр Ляончык. Трансляцыя на Маскву.

31 жніўня

Першая праграма. 8.55 — праграма перадач. 9.00—«На зарадку станавіся!» (М). 9.15— навіны (М). 9.30 — «Будзільнік» (М). 10.00 — «Музычны кіёск» (М.) 10.30—для дзяцей. «Заўтра ў школу». 10.55—для дзяцей. Тэлевізійны мастацкі фільм «Блакітны кубак». 12.00 — для школьнікаў. «З новым навучальным годам!» (М). 12.45 — «Навіны дня». Кіначасопіс (М). 13.00—«Сельская гадзіна». Перадача з Варонежа. 14.00—сёння — Дзень шахцёра (М). 15.15—навіны (М). 15.30—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «На варце». Перадача з Рыгі. 16.00—«Няўлоўныя мсціўцы». Мастацкі фільм (М). 17.15 — для дзяцей. «Воўка ў трыдзевятым царстве», «Кошкі-мышкі». Мультыплікацыйныя фільмы (М). 18.15 — «Клуб кінападарожнікаў» (М). 19.15— «На агеньчык». (М). 20.15—у эфіры — «Маладосць». «Праспект маладосці» (М). 21.30 — «Сем дзён» (М). 22.15—«Турнір дапытлівых». 22.55 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. Аматарам шашак. 23.15 — «Тандэм». Фільм-канцэрт. 23.45 — «Спартыўны тыдзень» (М).

Другая праграма. 10.30 — для юнацтва. «Лукамор'е». Літаратурны альманах (М). 11.30 — «Палац-музей у Астанкіне». (М). 19.00 — «Расказваюць афішы». Музычны агляд. 19.30 — заключны спектакль-канцэрт Чарнігаўскага музычна-драматычнага тэатра імя Т. Р. Шаўчэнкі. 22.15 — праграма каляровага тэлебачання. «Вяселле ў Малінаўцы». Мастацкі фільм (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі—6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63856 АТ 18307